Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 СТУДЗЕНЯ 2017 г. СЕРАДА № 2 (28366)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Я бачу... у сне

СТАР. 7




Каляндар рэлігійных святаў на 2017 год

СТАР. 8-9



«Самы пасцельны рэжым»

СТАР. 11

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**

*«Лячэнне ў беларускіх санаторыях заснавана на ўжыванні пераважна прыродных фактараў: мінеральных вод, гразяў азёр і балот, спрыяльнага клімату, прыродных ландшафтаў раслінных і водных аб'ектаў. Лячэбная база здраўніц краіны прадстаўлена не толькі прыроднымі фактарамі, але і сучаснымі фізіятэрапеўтычнымі метадамі (магніта-, фота-, электратэрапіяй, ультрагукавой і інгаляцыйнай тэрапіяй), масажам і лячэбнай фізкультурай, фітатэрапіяй, спелеатэрапіяй, крыятэрапіяй, рэфлексатэрапіяй, псіхатэрапіяй».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9666 | ▲ |
| Еўра | 2,0545 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0321 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0725 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

17002>

9 771990 763008

# Маленькія навасёлы



Фота БЕЛТА.

Жыхары Маскоўскага раёна сталіцы атрымалі перад самымі святамі выдатны падарунак — новы дзіцячы садок на 150 месцаў. На фота — яго выхаванцы, якія адзначылі наваселле з радасным настроем.

■ Дэклараванне

## Здаеш кватэру — падлічы «навар» за год

### А вось даходы ад продажу бабулінай нерухомасці падаткам не абкладаюцца

**Сёлета да 1 сакавіка трэба падаць у падатковыя органы дэкларацыю аб даходах за мінулы год. Тут варта адразу адзначыць, што далёка не ўсе абавязаны наведваць падатковую інспекцыю. Па-першае, дэкларацыі запаўняюць толькі падатковыя рэзідэнты нашай краіны. А гэта фізічныя асобы, якія фактычна знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі больш за 183 дні ў каляндарным годзе. Па-другое, у часткі плацельшчыкаў існуе толькі права падаць такую дэкларацыю, каб потым атрымаць падатковы вылік. Але ёсць і тыя, хто павінен абавязкова запаўняць падатковую дэкларацыю. Менавіта для іх «Звязда» сумесна са спецыялістамі Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) Беларусі падрыхтавала падрабязны тлумачальнік.**

### Аўтобус, грузавік ці другі «легкавік»

Да вясны абавязкова падаць дэкларацыю павінны тыя людзі, якія за мінулы год прадалі больш як адзін аўтамабіль, тэхнічна дапушчальная агульная маса якога не перавышае 3500 кг і колькасць сядзячых месцаў у ім, акрамя сядзення кіроўцы, не перавышае васьмі. Абавязак на дэклараванне пачынаецца пасля продажу ўжо аднаго грузавога аўтамабіля ці аўтобуса, калі ў першага агульная маса перавышае 3500 кг, а ў другога колькасць месцаў перавышае восем. Тут спецыялісты МПЗ удакладнілі, што, калі машына, якую вы прадалі, дасталася вам у спадчыну, падатак плаціць не трэба незалежна ад перыядычнасці адчужэння транспартных сродкаў на працягу каляндарнага года.

### Адна кватэра — за 5 гадоў

Запаўняць дэкларацыю па выніках года павінны тыя, хто на працягу 5 апошніх гадоў прадаў іншым фізічным асобам другую кватэру ці другі жылы дом, больш за адзін садовы домік, больш за адзін гараж (зямельны ўчастак, машына-месца), якія належаць чалавеку на праве ўласнасці.

СТАР. 4

■ Сацыяльны клопат

## Каўчэг для адзінокіх

### І ў паважаным узросце можна радавацца жыццю, займацца творчасцю і нават закахацца

**Я часта сустракаю гэту бабульку ў метро. Увосень яна спрабавала прадаць аксамміткі і нават крыху счарнелы пасля маразоў расходнік — усё, відаць, недзе прыхапкам сарванае. Апошнім часам яе бачу то з некалькімі галінкамі ядлоўцу, то з адным... пэндзлікам. Не з-за грошай старая стаіць у пераходзе: што можна выручыць за такі «тавар»? Яна бяжыць ад адзіноты, ад страху перад неадчэпнымі хваробамі. І няхай усе некуды спяшаюцца і не зважаюць на сарамлівую «гандлярку». Ёй спакайней — яна сярод людзей... За бясконцымі турботамі часта людзі не заўважаюць, як няўмольна падкрадаецца ссівелая старасць. Не ўсім яна выпадае светлай, «пагодлівай», у акружэнні клапатлівых дзяцей і ўнукаў. З некім лёс зрабіў нядобра: адабраў усіх родных. У іншых не складваюцца стасункі з блізкімі. На жаль, немагчыма застрахавацца ад адзіноты. А што рабіць, калі і сіл не стае змагацца з ёй?**

СТАР. 6



Бабуліны цуды.

■ Меркаванні

# АДКРЫТАСЦЬ І НАЦЭЛЕНАСЦЬ НА ПОСПЕХ

## Эксперты пра кірункі развіцця краіны ў новым годзе

**Традыцыйна навагодні зварот кіраўніка дзяржавы падсумоўвае вынікі мінулага года і, самае галоўнае, акрэслівае перспектывы на новы. «Звязда» папрасіла вядомых палітыкаў, грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў выказацца з нагоды асноўных акцэнтаў, якія зрабіў у сваім навагоднім віншаванні Прэзідэнт.**



***Сяргей ГАЙДУКЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:***

— Адкрытасць нашай краіны, пра якую казаў Прэзідэнт, — гэта не проста «адкрылі». Гэта значыць, мы далучаемся да ўсіх вектаральных кірункаў у інтарэсах сваёй дзяржавы, тых дзяржаў, якія хочуць выйсці з намі на больш шчыльнае палітычнае, эканамічнае супрацоўніцтва. Гэта вельмі выгадна, тым больш у сітуацыі, у якой цяпер знаходзіцца многія краіны свету.

У нас вельмі паспяховай атрымалася Мінская перагаворная пляцоўка, яна дапамагла наладзіць адносіны з многімі. Можам нават, дзе трэба, прадстаўляць інтарэсы той ці іншай краіны... Адкрытасць значыць далейшае наладжванне ўзаемадзеяння з усімі краінамі. Натуральна, не толькі з суседзямі.

Зараз стратэгічная задача ў нас адна — з краінамі, што нас акружаюць або знаходзяцца далей, выбудоўваць сапраўдную шматвектарную палітыку, добрыя адносіны. Гэта не павінна залежаць ні ад палітычных рознагалоссяў. Трэба, каб адносіны з суседзямі мелі цвёрдую, стабільную пазіцыю — незалежна ад таго, якія там могуць адбывацца ўнутраныя падзеі.



***Уладзіслаў ШЧЭПАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:***

— Наша Пастаянная камісія курыруе пытанні актывізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, паляпшэння ўмоў вядзення бізнесу. Ёсць некалькі сур'ёзных кірункаў для работы — дэбюракратызацыя, удасканаленне адміністрацыйных працэдур, Адміністрацыйнага і Крымінальнага кодэксаў — у прыватнасці, зніжэнне рызык вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці. Гэта значыць, змяншэнне адказнасці па артыкулах, якія не ўплываюць грамадскай небяспекі.

Важным кірункам з'яўляецца ўдасканаленне дзейнасці кантрольных і праваючых органаў, якая часта прыводзіць не толькі да выканання заканадаўства, але і да з'яўлення дадатковых затрат бізнесу і нават да закрыцця асобных арганізацый.

Перад краінай цяпер стаіць пытанне аб стварэнні вялікай колькасці працоўных месцаў — мінімум 50 тысяч на год. Прычым важна, каб гэтыя працоўныя месцы былі высокапрадукцыйнымі, каб там прымяняліся інфармацыйныя тэхналогіі, паколькі нам неабходна забяспечыць канкурэнтаздольнасць нашай прадукцыі не толькі ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, але і на сусветным рынку ў цэлым. Перспектыўнымі з'яўляюцца прадукцыя і паслугі, зробленыя для ўсяго свету, — напрыклад, праграмныя прадукты, мікрахімія, нана- і біятэхналогіі, што асабліва актуальна ў Год навукі. У іх вытворчасці роля малога і сярэдняга бізнесу недаацэненая.

Неабходна зніжаць усе рызыкі, якія толькі магчымыя для бізнесу, паляпшаць макраэканамічную сітуацыю — крэдыты ў беларускіх рублях павінны каштаваць ніжэй за 10%. Важна выйсці і на еўрапейскія рынкі, уступіць у Сусветную гандлёвую арганізацыю — каб у нашага бізнесу было большае поле для дзейнасці. Аднак трэба падкрэсліць, што і ўзровень канкурэнцыі ў такім выпадку вырасце, і нам трэба быць гатовымі да таго, каб нават на сваім рынку чакаць канкурэнтаў з іншых краін. Гэта будзе вельмі складана, трэба зараз да гэтага рыхтавацца і працаваць у тым ліку над паляпшэннем заканадаўства.



***Уладзімір ДВОРНІК, старшыня Гомельскага аблвыканкама:***

— У сваім навагоднім звароце да беларускага народа Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Мы ствараем новыя вытворчасці, будуем дарогі, электрастанцыі, важныя сацыяльныя аб'екты і жылыя дамы. Добраўпарадкоўваем гарады і вёскі. З кожным годам Беларусь набывае ўсё больш сучаснае еўрапейскае аблічча». Што тычыцца Гомельшчыны, паляпшэнню дабрабыту яе жыхароў спрыяе маштабная мадэрнізацыя прамысловых гігантаў, стварэнне ў вобласці амаль 700 новых прадпрыемстваў і больш шасці тысяч працоўных месцаў. Па версіі рэспубліканскай канфедэрацыі прафсаюзаў, Гомельская вобласць трэці раз прызнана лепшай для вядзення бізнесу. У 2016 годзе мы адкрылі трасу М-5 і пусцілі электрагягнікі бізнес-класа. У Брагінскім раёне пачаў працаваць самы буйны ў Беларусі парк сонечных батарэй. Трагедыя на Чарнобыльскай АЭС, якая адбылася 30 гадоў таму, нас не зламала. Мы даказалі ўсяму свету, што сумеснымі намаганнямі можна пераадолець наступствы нават самай страшнай тэхнагеннай катастрофы ў гісторыі.



***Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:***

— У сучасным беларускім грамадстве ўсё большая ўвага надаецца арганізацыі навуковых даследаванняў. Менавіта ад узроўню развіцця навукі ў многім залежыць дзяржаўная бяспека краіны, а таксама сацыяльна-эканамічны і духоўна-культурны стан жыцця народа. У навагоднім віншаванні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь падкрэслена, што Год навукі ў нашай краіне павінен прайсці пад знакам абнаўлення ва ўсіх абласцях жыццядзейнасці грамадства.

У Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі штогод шмат робіцца дзеля навуковага забеспячэння развіцця ўсіх сфер. Асабліва вялікія планы звязаны з аб'яўленнем 2017-га Годам навукі. Напрыклад, у Аддзяленні гуманітарных навук і мастацтваў НАН запланавана правядзенне больш як 70 буйных навукова-практычных мерапрыемстваў і ажыццяўленне выдавецкіх праектаў. У 2017 годзе краіна будзе шырока святкаваць 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, таму наперадзе — насычаны і напружаны перыяд супольнай працы навукоўцаў, работнікаў сферы адукацыі, культуры і інфармацыі. Шэраг навукова-асветніцкіх мерапрыемстваў будзе праведзены і ў рэгіёнах нашай краіны.

Уся дзейнасць гуманітарнай навукі накіравана на ўмацаванне міжнацыянальнага і міжканфесійнага адзінства, што дапаможа стваральнай працы на карысць беларускага народа.



***Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ, начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў:***

— Кругласутачная работа супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, якая патрабуе найвялікшай вытрымкі і смеласці, — залог грамадскай стабільнасці і ўстойлівага развіцця дзяржавы.

Увогуле апошнім часам шмат зроблена па супрацьдзеянні незаконнай міграцыі, нелегальнаму абароту спіртных напояў, распаўсюджванню наркотыкаў. Намаганні міліцыі таксама накіраваны на забеспячэнне дарожнай бяспекі, ахову грамадскага правапарадку ў месцах масавага знаходжання грамадзян, абарону адзінокіх старых і прафілактыку падлеткавай злачыннасці. У фокусе нашай увагі гэтыя пытанні застануцца і ў 2017 годзе.

Назапашана шмат канструктыўных ідэй і прапаноў па далейшай аптымізацыі заканадаўства ў нашай сферы. Напрыклад, плануецца распрацаваць комплексны закон аб прафілактыцы гвалту ў сям'і. Ужо падрыхтаваны праект закона аб ахове грамадскага парадку і забеспячэнні бяспекі на спартыўных мерапрыемствах. Яго галоўная сутнасць — забарона на наведванне матчаў і спаборніцтваў для фанатаў-хуліганаў.

Застаючыся на вастрыі нацыянальнай бяспекі, мы і надалей будзем рабіць сваю работу больш эфектыўнай, карыснай і значнай як для ўсёй краіны, так і для кожнага яе грамадзяніна.



***Святлана КОВАЛЬ, кансультант аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:***

— За апошнія два гады ў краіне адзначаецца абсалютны прырост насельніцтва. Колькасць насельніцтва на 1 кастрычніка 2016 года склала 9 мільёнаў 505 тысяч чалавек (плюс 6,8 тысячы чалавек у параўнанні з пачаткам года). Значна павялічыўся ўзровень нараджальнасці. У бягучай пяцігодцы нарадзілася больш за 580 тысяч дзяцей, з іх каля 57 працэнтаў — другія і наступныя. Шматдзетных сем'яў у краіне ўжо налічваецца больш за 86 тысяч, па звестках перапісу 2009 года іх было 62,5 тысячы.

Меры сацыяльна-эканамічнай падтрымкі сем'яў накіраваны на ўсе катэгорыі сем'яў, у якіх чакаецца нараджэнне дзіцяці альбо ўжо выхоўваюцца непаўналетнія. Сёння сем'ям з дзецьмі ў Беларусі прызначаюцца 11 відаў дапамогі. Самая значная з іх — дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. У 2015 годзе расходы на выплату дапамогі склалі 2% ВУП (у 2014 годзе — 1,7%). Усе гэтыя выдаткі апраўданыя, бо дазволілі дасягнуць галоўнай мэты — павялічыць нараджальнасць. Выплатамі ахоплена амаль 552 тысячы дзяцей.

Шматдзетныя сем'і — гэта асаблівая катэгорыя, якой дзяржава прадастаўляе дадатковыя меры падтрымкі ў розных сферах жыццядзейнасці: пры карыстанні дзіцячымі дашкольнымі і іншымі агульнаадукацыйнымі ўстановамі, у сферы жыллёва-крэдытнай палітыкі, працоўнага, падатковага, пенсійнага заканадаўства, пры аплаце жыллёва-камунальных паслуг.

Сістэма падтрымкі шматдзетных сем'яў узмоцнена ўвядзеннем з 2015 года новага элемента — сямейнага капіталу. Праграма разлічана на 5 гадоў — з 1 студзеня 2015-га па 31 снежня 2019-га. Па стане на 1 снежня 2016 года адкрыта 28 824 дэпазітныя рахункі на суму звыш 288 мільёнаў долараў ЗША ■

■ Вынікі і высновы

# СЕНСАЦЫЙНЫЯ ВЫБАРЫ І РАЗГУЛ ТЭРАРЫЗМУ



## Якім быў мінулы год для палітыкаў у свеце

2016 год быў шчодры на сюрпрызы. З усіх яго нечаканасцяў самай раскручанай стала **перамога Дональда Трампа,** спачатку на праймерыз ад рэспубліканцаў, а потым, усё як паўнамоцнага кандыдата ад рэспубліканцаў, на прэзідэнцкіх выбарах. Дональд Трамп, здавалася б, пагрэбаваў усімі канонамі выбарчай кампаніі, уключаючы паліткарэктнасць, але на самай справе яго вяло чуцьё дасведчанага тэлевядучага. Доўгія гады прапрацаваўшы ў масмедыя, Трамп набыў здольнасці разумець аўдыторыю і казаць ёй тое, што будзе запатрабавана. Ён зразумеў, што XXI стагоддзе становіцца часам усё большай запатрабаванасці шоу-бізнесу ў прэзідэнцкіх кампаніях, і выкарыстаў гэтае разуменне на поўную катушку. Ён спаўна выкарыстаў усе магчымасці сацыяльных сетак, у адрозненне ад каманды Хілары Клінтан. У той жа час, вельмі магчыма, ён стаў апошнім прэзідэнтам ад амерыканскага народа, абранага белай большасцю. Этнічныя меншасці, колькасць якіх імкліва расце на тэрыторыі ЗША, галасавалі ў асноўным за Хілары Клінтан. Але нават галасоў пакуль яшчэ дамінуючых белых Трампу ў поўнай меры не хапіла, каб атрымаць перамогу, — яна стала магчымай толькі дзякуючы састарэлай электаральнай сістэме ЗША. Як гэта ні здаецца парадаксальным, Трамп стаў прэзідэнтам, набраўшы на 2,9 мільёна галасоў выбаршчыкаў менш, чым Клінтан. Ну, а яго прыход да ўлады 20 студзеня 2017 года стане самай чаканай падзеяй пачатку 2017 года, таму што ад Трампа чакаюць новых сюрпрызаў — як ва ўнутранай і знешняй палітыцы, так і ў эканоміцы. Што непазбежна адаб'ецца на свеце, у якім ЗША пакуль што адзіная звышдзяржава.

У 2016 годзе восенню з невялікай разбежкай прайшлі **парламенцкія выбары ў Расіі і Беларусі.** Прайшлі без вялікіх сюрпрызаў — пераважная большасць кандыдатаў прыйшла ў расійскі і беларускі парламенты з праграмамі далейшага суверэннага развіцця і захавання еўразійскага вектара інтэграцыі. Надзеі некаторых нядобразычлівых з-за мяжы на негатыўныя сцэнарыі (асабліва вялікі націск з нагоды выбараў быў гэтым разам аказаны на Расію, у адрозненне ад папярэдніх парламенцкіх выбараў) не апраўдаліся.

2016 год запомніцца як **год разгулу тэрарызму на тэрыторыі Еўрапейскага саюза.** Несумненна, што буйныя тэракты былі ў ЕС і раней, але іх аддзялялі адзін ад аднаго вялікія перыяды часу. Напрыклад, паміж маштабнымі тэрактамі ў прыгарадных цягніках Мадрыда 2004 года і лонданскім метро (2005 год) прайшло больш за год і тры месяцы. 2016 год прадоўжыў традыцыі пастаянных маштабных тэрактаў 2015 года. 22 сакавіка ў Бруселі ў выніку скаардынаваных нападаў у метро і аэрапорце загінула 35 чалавек. 14 ліпеня ў Ніцы ў выніку выезду на набярэжную тэрарыста на грузавіку загінула 82 чалавекі. 19 снежня ў Берліне тэрарыст выкарыстаў сцэнарый тэракту ў Ніцы на калядным кірмашы, але, на шчасце, змог забіць толькі 12 чалавек. Астатніх выратавала тое, што ў новага грузавіка стаяла аўтаматычная сістэма тармажэння пры сутыкненні з староннімі аб'ектамі, якая, спрацаваўшы, заглушыла рухавік машыны. Калі б не гэта, загінулых было б значна больш. Сур'ёзна вырас лік і невялікіх па колькасці ахвяр тэрактаў. Падобна на тое, што тэрарыстычная актыўнасць стане сур'ёзным фактарам 2017 года. Гэтая хваля тэрарызму, якая ажыццяўляецца па ідэалагічных меркаваннях, нагадвае ранейшую магутную хвалю тэрактаў у Заходняй Еўропе ў 1970-х гадах. Адзінае адрозненне — тады тэрарызм быў марксісцкім, а цяпер ажыццяўляецца на хвалі радыкальнага ісламізму.

Самым незвычайным прэзідэнтам года стаў **новы кіраўнік філіпінскай дзяржавы.** Радрыга Дутэртэ стаў прэзідэнтам 30 чэрвеня гэтага года. Папярэдняя палітычная дзейнасць на пасадзе мэра буйнога горада Давава зрабіла Дутэртэ папулярным з-за радыкальных метадаў барацьбы з наркамафіяй. У многіх дзяржавах свету змагаюцца з гандлярамі наркотыкамі, але метады новага прэзідэнта досыць неардынарныя. У прыватнасці, нядаўна ён прызнаўся, што на пасадзе мэра асабіста расстрэльваў без суда і следства наркагандляроў і на тое ж арыентаваў паліцыю. Часта забівалі і спажыўцоў наркотыкаў. Распаўсюджванне метадаў па барацьбе з наркагандлем, раней прынятых у адным горадзе, на ўсе Філіпіны пасля прыходу Дутэртэ да ўлады, выклікала хвалю крытыкі з-за мяжы. Але новы кіраўнік дзяржавы трымае ўдар, прыстрашыўшы выйсці з ААН у выпадку далейшай крытыкі і нават зусім беспакарана абразіў Барака Абаму і генеральнага сакратара ААН. Магчыма і рэзкае змяненне знешнепалітычнага курсу Філіпін ад ранейшага цеснага супрацоўніцтва з ЗША да большай арыентацыі на Расію і Кітай, як пра гэта ў кастрычніку 2016 года заявіў сам Дутэртэ.

Пазітывам 2016 года стала **актывізацыя барацьбы з Ісламскай дзяржавай.** Энергічныя дзеянні Расіі ў Сірыі прымусілі актывізавацца і Захад, які раней аддаваў перавагу дэклараванню барацьбы з гэтай тэрарыстычнай арганізацыяй, а не вядзенню яе на справе. У выніку галоўным дасягненнем стала вызваленне Алепа сірыйскай арміяй пры падтрымцы Расіі ў снежні 2016 года. А іракскія войскі пры падтрымцы пабудаванай амерыканцамі кааліцыі пачалі паспяховае наступленне на Масул, які знаходзіцца на тэрыторыі Ірака.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук** ■

# СВЯТА ПРАЙШЛО СПАКОЙНА

## Але без выкліку экстранных службаў усё ж не абышлося

**Агучаныя на мінулым тыдні меры бяспекі падчас навагодніх гулянняў у грамадскіх месцах далі свой плён. Як адзначылі ў Міністэрстве ўнутраных спраў Беларусі, на такіх пляцоўках нейкіх надзвычайных здарэнняў, злачынстваў і грубых парушэнняў парадку ў святочную ноч зафіксавана не было.**

Але без здарэнняў, як кажуць, прыватнага характару, не абышлося. Па-за межамі грамадскіх месцаў некаторыя людзі адзначылі Новы год шумна ў літаральным сэнсе гэтага слова. І больш за тое, з наступствамі. У адной са сталічных шматпавярховак навагодняй раніцай разыгралася драма са стралянінай. У 6.40 па нумары 102 паскардзіўся нехта з жыхароў, што ў адной з кватэр вельмі моцна шумяць і перашкаджаюць адпачываць. Туды быў адпраўлены міліцыянер, які на лесвічнай пляцоўцы ўпэўніўся: гучны шум у пад'ездзе сапраўды прысутнічае. Пасля гэтага ўсё і закруцілася.

— Спробы паўшчуваць няйбайнага нецвярозага суседа аказаліся марнымі, — паведаміў **афіцыйны прадстаўнік ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр ЛАСТОЎСКІ.** — Ён ударыў міліцыянера ў грудзі, пасля пачаў біць па галаве і паспрабаваў адабраць табельную зброю. Папярэджанне «Страляць буду!» прымусіла міма вушэй нападніка. Завязалася барацьба, падчас якой сяржант міліцыі спярша зрабіў папераджальны стрэл, а пасля ўжо два — на паражэнне, імкнучыся пры гэтым нанесці мінімальны ўрон. Абодва ўдзельнікі інцыдэнту шпіталізаваны. Распачата крымінальная справа па артыкуле 363 Крымінальнага кодэкса — «Супраціўленне супрацоўніку органаў унутраных спраў».

Сваю лепту ўнесла і піратэхніка. Па словах **кансультанта аддзела першаснай медыцынскай дапамогі галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Наталлі ПУГАЧОВАЙ,** з 25 снежня ў Беларусі ад святочных выбухаў пацярпелі 30 чалавек. Напрыклад, у навагоднюю ноч два з іх атрымалі лёгкую кантузію вочнага яблыка, яшчэ ў аднаго паранена далонь. Чацвёртаму чалавеку петарда апаліла палец на правай руцэ. А вось у Віцебску 23-гадовы хлопец трапіў у бальніцу з апёкам жывата пасля таго, як няўдала запусціў петарду каля інтэрната.

Не абышліся святы і без п'яных кіроўцаў за рулём. Як зазначыў **старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Станіслаў САЛАВЕЙ,** з 30 снежня па 2 студзеня былі затрыманы 344 нецвярозыя вадзіцелі, з іх 132 — 1 студзеня. На дарогах загінулі 8 чалавек. Большасць з іх парушылі правілы дарожнага руху — пагрэбавалі святлоадбівальнымі элементамі, некаторыя выйшлі на дарогу ў нецвярозым стане.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

# СУСТРЭЧА НА ЛЁДЗЕ

## Сёння стартуе неафіцыйны чэмпіянат свету па хакеі сярод аматараў

**Яшчэ 2 студзеня госці пачалі прыбываць у сталіцу Беларусі на традыцыйны Калядны турнір. Першымі ў Мінск прыляцелі нямецкія хакеісты, асноўная ж частка ўдзельнікаў спаборніцтваў прыбыла на месца прызначэння ўчора. Госці ўжо размясціліся і сёння гатовы ўступіць у першыя лядовыя баі.**

У складзе каманд XIII Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея нямала гульцоў, ужо добра вядомых не толькі беларускім балельшчыкам. На лёдзе «Чыжоўка-Арэны» мы ўбачым хакеістаў, якія выступалі ў наймацнейшай лізе свету — НХЛ, а таксама прызёраў самых прэстыжных міжнародных хакейных турніраў. За зборную Славакіі, напрыклад, выступяць Мірaслаў Шатан, Марцін Штрбак, Любамір Секераш і Петэр Падградскі. Іх трэнерам з'яўляецца добра вядомы нам спецыяліст — Юліус Шуплер. За Германію на лёд выйдзе знаёмы беларускім белельшчыкам ветэран хакея Эдуард Бшайд, за расіян — вядомы Леанід Фацікаў. Гаспадары будуць прадстаўлены камандай кіраўніка дзяржавы, у складзе якой вядомыя ў хакейным свеце Сяргей Стась, Аляксандр Радзінскі, Вадзім Бекбулатаў, Канстанцін Кальцоў, Андрэй Міхалёў і Яраслаў Чупрыс.

Беларусы традыцыйна лічацца аднымі з фаварытаў Каляднага турніру. Адзначым, за 12 гадоў у актыве нашай каманды ўжо ёсць 9 перамог гэтых спаборніцтваў, тройчы поспех святкавала расійская зборная.

Нагадаем, што ўсе матчы прыме «Чыжоўка-Арэна». Уваход на гульні, у тым ліку фінальныя, вольны. Арганізатары абяцаюць, што, акрамя захапляльнага хакея, балельшчыкі ўбачаць і цікавую забаўляльную праграму.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*




■ Адкрыцці

# НЕРВОВЫЯ КЛЕТКІ... АДНАЎЛЯЮЦЦА!

**У Нацыянальнай акадэміі навук традыцыйна назвалі топ-10 вынікаў працы за 2016 год у вобласці фундаментальных даследаванняў. У выніковы спіс увайшлі найлепшыя работы айчынных вучоных з розных інстытутаў.**

Ганаровы спіс адкрывае даследаванне маладых навукоўцаў з Інстытута фізікі імя Б.І. Сцяпанава, якія вынайшлі метад для ажыццяўлення эфектыўнай квантавай тамаграфіі святла. Вынікі работы былі апублікаваны ў самым прэстыжным навуковым выданні — часопісе Nature. Супрацоўнікі гэтай жа ўстановы прадказалі і рэалізавалі новы тып светлавых палёў — лазерных пучкоў Эйры. Навукоўцы з Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі распрацавалі новы метад камп'ютарнага аналізу складаных выяў вялікіх памераў, ён ужо выкарыстоўваецца медыкамі для выяўлення раку грудзей на ранняй стадыі. Супрацоўнікі ДНВА «Парашковай металургіі» даследавалі працэсы спякання крэмнію і вугляроду з нанадабаўкамі, вынікам працы скарыстаюцца пры стварэнні астранамічных люстэркаў вялікага памеру. У Навукова-практычным цэнтры НАН па матэрыялазнаўстве выявілі стымуляванае і лазернае выпраменьванне ў шматкампанентных паўправадніках, што можа быць выкарыстана пры стварэнні сонечных элементаў новага пакалення.

Вучоныя Інстытута фізіка-арганічнай хіміі сінтэзавалі тлустыя кіслоты, якія могуць значна запавольваць біяхімічныя рэакцыі, што прыводзяць да разнастайных паталогій. Іх напрацоўкай скарыстаюцца пры стварэнні лекаў. А калектыў супрацоўнікаў Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі і Інстытута фізіялогіі атрымаў прынцыповыя даныя для прафілактыкі і лячэння парушэнняў метабалізму і нейрадэструктыўных паталогій. Адзначаецца, што вынік работы паказвае шлях да рашэння праблемы рэгенерацыі нервовых клетак. Традыцыйна ў спіс трапілі і археолагі з Інстытута гісторыі. Яны адкрылі і даследавалі археалагічны комплекс Кардон у Віцебскім Падзвінні, унікальны для Усходняй Еўропы помнік эпохі вікінгаў (VIII—X стагоддзі). А вучоныя Навукова-вытворчага цэнтра па земляробстве атрымалі рэгенераты з пылькоў жыта, што дазволіць значна паскорыць яго селекцыю.

■ Багацце краіны

# «ЧОРНАГА ЗОЛАТА» СТАЛА БОЛЬШ

## У Гомельскай вобласці знайшлі новае радовішча нафты

**Яно знаходзіцца ў прамежкавым блоку рэгіянальнага Рэчыцка-Вішанскага разлому Прыпяцкага прагіну і атрымала назву Вугольскае.**

Як паведамляюць у прэс-службе прадпрыемства «Беларуснафта», новае радовішча аднасіцца да катэгорыі цяжкадаступных запасаў, бо знаходзіцца ў нізкапрапушчальным калектары на адносна вялікай глыбіні — прыкладна 5200 метраў. У той жа час становічым фактарам для распрацоўкі з'яўляецца вельмі высокі пластавы ціск.

Геалагічныя запасы Вугольскага цяпер ацэньваюцца прыкладна ў 1,7 мільёна тон, больш дакладную ацэнку можна будзе зрабіць ужо сёлета пасля бурэння разведвальнай свідравіны №2. У прэс-службе Беларуснафты адзначаюць, што існуючыя метады распрацоўкі падобных радовішчаў дазваляюць выпампаваць з іх каля трэціны ад геалагічных запасаў, таму Вугольскае для нашай краіны лічыцца сярэднім па аб'ёме. Тым не менш здабыча «новай» нафты ўжо вядзецца — радовішча перадалі ў распрацоўку нафтагазаздабываючаму ўпраўленню «Рэчыцанафта».

Сама пляцоўка была выяўлена і падрыхтавана да бурэння яшчэ дваццаць гадоў таму, але дакладнай упэўненасці ў наяўнасці радовішча ў нафтавікоў не было. У 2014 годзе геолагі правялі дадатковыя работы і пры дапамозе сучаснага метаду 3D-сейсмаразведкі атрымалі больш падрабязную інфармацыю.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Мароз прыцісне...

## На выхадныя сіноптыкі месцамі абяцаюць да мінус 27 градусаў

**Даволі рэзкае пахаладанне чакаецца ў Беларусі на гэтым тыдні, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Спецыяліст адзначыў, што ў першы тыдзень новага года надвор'е будзе вельмі зменлівым, бо спачатку чакаецца моцны снег і парывісты вецер, а потым — істотнае ўзмацненне маразоў. А сёння ўздзень на тэрыторыі Беларусі будуць гаспадарыць актыўныя атмасферныя франты, якія прынясуць да нас складаныя ўмовы надвор'я. Паўсюдна пройдзе снег, на большай частцы тэрыторыі моцны снег і слабая мяцеліца.

Потым сур'ёзная непагадзь пачне рухацца ў бок Расіі, а ў Беларусь прыйдуць з поўначы халодныя паветраныя масы. Пахаладае. У чацвер на большай частцы тэрыторыі прагназуецца снег, уначы ў асобных раёнах моцныя апады. У некаторых раёнах мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Уначы па паўночназаходняй палове, а раніцай і ўдзень — у многіх раёнах краіны прагназуецца ўзмацненне ветру, парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература на працягу сутак складзе 8—15 марозу, аднак па паўднёвым усходзе — яшчэ толькі да мінус 1—7 градусаў.

Па-сапраўднаму марозіць нас пачне ўжо ў пятніцу, калі ў некаторых раёнах, пераважна па ўсходняй палове краіны, чакаецца невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 13 да мінус 20 градусаў, а ўначы па паўночнай палове пры праясненнях — да 23 марозу. Але і гэта яшчэ не ўсё.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, самае сур'ёзнае пахаладанне чакае нас на выхадныя. У суботу ў асобных раёнах краіны пройдзе невялікі снег, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 15—22, а пры праясненнях будзе да 27 марозу. Удзень таксама будзе шчыпаць за вушы, бо прагназуецца да мінус 11—18 градусаў, а па ўсходзе — да 20 марозу. Валёнкі нам спатрэбяцца і ў нядзелю. Прагназуецца, што 8 студзеня ў асобных раёнах краіны магчымы кароткачасовы снег, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы застанецца на ўзроўні ад мінус 15 да мінус 22 градусаў, а пры праясненнях — да 27 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

### Несспрыяльныя дні і гадзіны ў студзені

| | |
|---|---|
| 6, пятніца, 10.00 — 22.00 | 19, чацвер, 11.00 — 24.00 |
| 8, нядзеля, 4.30 — 23.00 | 22, нядзеля, 3.30 — 12.30 |
| 10, аўторак, 23.30 — 24.00 | 24, аўторак, 19.30 — 24.00 |
| 12, чацвер, 13.30 — 24.00 | 27, пятніца, 9.00 — 10.30 |
| 14, субота, 17.00 — 24.00 | 29, нядзеля, 8.00 — 18.00 |
| 15, нядзеля, 0.00 — 6.00 | 31, аўторак, 19.30 — 23.30 |
| 17, аўторак, 8.00 — 13.00 | |

# СЕМ З СЯМІ

## Як беларусы выйгралі хакейны турнір у Канадзе

**У Калгары ў першыя дні новага года завяршыўся прэстыжны юнацкі міжнародны турнір Mac's Midget AAA World Invitational Tournament. Сёлета ў спаборніцтвах прынялі ўдзел 25 мужчынскіх каманд з Канады, ЗША і Еўропы, а наймацнейшымі сталі беларусы.**

У ходзе турніру наша юнацкая зборная (U-17) атрымала 4 перамогі ў сваёй групе і заняла там першае месца. У чвэрцьфінале беларусы нанеслі паражэнне Red Deer Optimist Chiefs — 4:0, а ў паўфінале ў авертайме былі мацнейшыя за Cariboo Cougars — 5:4.

За галоўны трафей турніру нашы хлопцы змагаліся з Saskatoon Contacts, якія выступаюць у найстарэйшай юнацкай хакейнай лізе правінцыі Саскачэван (Канада), і атрымалі чарговую буйную перамогу — 6:1. Такім чынам, з сямі гульняў у нашых хакеістаў сем перамог і першае месца на турніры ў Канадзе.

*— У вырашальнай сустрэчы хакеісты Saskatoon Contacts разумелі, што беларусы аб'ектыўна мацнейшыя. Мы ўпэўнена дзейнічалі ў абароне і ў атацы. Менавіта паніклы настрой саперніка ў нейкай ступені дапамог дабіцца поспеху. Наша юнацкая зборная на турніры ў Канадзе была сапраўднай камандай, усе хлопцы падтрымлівалі адзін аднаго. Гэта ўжо сфармаваны калектыў, які будзе вельмі складана абыграць і ў далейшым,* — адзначыў **галоўны трэнер юнацкай зборнай (U-17) Беларусі па хакеі Уладзімір Магдзееў.**

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## Ацэнка зямлі

# У ВАЛЮЦЕ ЦЭННІК УЧАСТКАЎ НАВАТ ЗНІЗІЎСЯ

**У Мінску і Мінскім раёне кадастравы кошт зямель жылой сядзібнай зоны знізіўся ў доларах (паводле новай ацэнкі у параўнанні з папярэдняй), але павялічыўся ў беларускіх рублях, паведамляе прэс-служба Дзяржаўнага камітэта па маёмасці.**

У прыватнасці, такія высновы былі зроблены спецыялістамі камітэта пасля тэсціравання вынікаў кадастравай ацэнкі зямель, якое адбылося ў Нацыянальным кадастравым агенцтве (НКА) Дзяржкаммаёмасці. Эксперты агенцтва адзначылі, што новы кадастравы кошт зямель у сталіцы ў беларускіх рублях па відзе функцыянальнага выкарыстання «жылая сядзібная зона» павялічыўся ў 1,72 раза, у Мінскім раёне — у 2,15 раза. У доларавым эквіваленце ў сярэднім па Мінску назіраецца зніжэнне кадастравага кошту зямлі на 28%, у сельскіх населеных пунктах Мінскага раёна — на 11%. Найбольшую цэнавую стабільнасць у валюце прадэманстравалі садовыя таварыствы і дачныя кааператывы Мінскага раёна, дзе зніжэнне кадастравага кошту зямлі ў доларах склала ўсяго 2%.

Паводле слоў спецыялістаў, захаванне попыту на нерухомасць у Мінскім раёне абумоўлена абмежаваннямі на выдзяленне зямельных участкаў у беларускай сталіцы. Выбар прыгарада тлумачыцца таксама і некаторым зніжэннем пакупніцкай здольнасці. Справа ў тым, што кадастравы кошт зямлі пад жылую сядзібную нерухомасць у Мінскім раёне па-ранейшаму ніжэй аналагічных сталічных значэнняў.

У 2016 годзе спецыялісты НКА правялі кадастравую ацэнку зямель па відах функцыянальнага выкарыстання «жылая сядзібная зона» і «рэкрэацыйная зона» ў 202 гарадах, 23 181 сельскім населеным пункце і 4 380 садовых таварыствах, а таксама імі ацэнены землі па-за межамі населеных пунктаў, садовых таварыстваў і дачных кааператываў 118 раёнаў. Падрабязны аналіз рынку нерухомасці дазволіў выявіць фактары, якія ўплываюць на рынкавы і кадастравы кошт. Напрыклад, у Лагойскім раёне павышэнню рынкавага і адпаведна кадастравага кошту зямель спрыяла даступнасць гарнальжных цэнтраў, у Вілейскім раёне — Вілейскага вадасховішча, у Мядзельскім раёне — азёр Мядзел, Нарач і Баторына.

Папярэднія вынікі такой кадастравай ацэнкі зямель па відах функцыянальнага выкарыстання «жылая сядзібная зона» і «рэкрэацыйная зона», а таксама зямель садовых таварыстваў і дачных кааператываў будуць накіраваны на ўзгадненне ў мясцовыя органы ўлады да канца студзеня гэтага года. Новыя вынікі ацэнкі будуць выкарыстоўвацца ўсімі зацікаўленымі службамі з 1 студзеня 2018 года пасля зацвярджэння іх мясцовымі органамі ўлады і ўнясення ў адпаведны рэгістр ■

## Ініцыятыва

# ХТО АДКАЖА ЗА САЦЫЯЛЬНУЮ РЭКЛАМУ?

**«Рэкламшчыкі» выступаюць за стварэнне стратэгіі развіцця прафесійнага рынку**

**Асацыяцыя рэкламных арганізацый (АРА) прапануе стварыць пры Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ) экспертную групу з самых аўтарытэтных прадстаўнікоў усіх сегментаў рэкламнага рынку**

У прэс-службе асацыяцыі журналісту «Звязды» паведамілі, што найбліжэйшай практычнай мэтай гэтай групы можа стаць распрацоўка комплексу мер па ўдасканаленні рэкламнага заканадаўства і стратэгіі развіцця рэкламнага рынку краіны.

**Пытанне адказнасці**

Асацыяцыя прапануе вярнуць у Закон «Аб рэкламе» дакладны падзел адказнасці ўсіх удзельнікаў працэсу стварэння і размяшчэння рэкламы, як гэта было ў першых яго рэдакцыях. Спецыялісты лічаць аб'ектыўнай неабходнасцю ўвядзенне ў нарматыўную прававую тэрміналогію азначэння «сацыяльныя сеткі», бо яны даўно сталі адным з вядучых спосабаў сучаснай камунікацыі.

Шэраг прапаноў АРА тычыцца медыядаследаванняў: прыцягнуць да іх фінансавання ўсіх зацікаўленых удзельнікаў рынку і, перш за ўсё, тэлеканалы; прыняць правілы выкарыстання такіх даследаванняў (ТБ) з забеспячэннем доступу да іх толькі афіцыйным пакупнікам; дапусціць апублікаванне любых рэйтынгаў медыя-агенцтваў толькі пры абавязковым узгадненні ТБ-сэлераў; распрацаваць комплекс мер па абароне рынку тэлерэкламы ад нядобрасумленных і непрафесійных удзельнікаў.

**Прынцып адзінага ўзгаднення**

Эксперты асацыяцыі лічаць неабходным кардынальна спрасціць працэдуру ўзгаднення рэкламнага сюжэту або ўвесці прынцып адзінага ўзгаднення. Калі, напрыклад, сюжэт для тэлевізійнай рэкламы паспяхова рэалізаваны на практыцы, то выкарыстанне візуальнага шрыфту, лагатыпаў і вобразаў гэтага сюжэту без змен у вонкавай рэкламе або інтэрнэт-банерах не павінна патрабаваць дадатковых сцвярджэнняў.

Прапануецца таксама зняць абавязковыя патрабаванні Міністэрства аховы здароўя аб чытанні на радыё ўсёй інфармацыі аб рэкламаваным медыцынскім прэпараце і скарыціць тэрмін узгаднення рэкламных матэрыялаў па фармацэўтычных катэгорыях да 10—14 дзён.

Больш сур'ёзнага падыходу, упэўнены спецыялісты, заслугоўвае сацыяльная рэклама, якая заклікана не толькі прыцягваць увагу грамадства да сацыяльна-значных праблем, але і фарміраваць новыя каштоўнасныя арыенціры. Для таго каб былі дасягнуты менавіта гэтыя высокія мэты, а не супрацьлеглыя, як часта выходзіць на практыцы, кожны этап рэкламнай кампаніі павінен быць спланаваны і прафесійна рэалізаваны. Таму абавязковай умовай стварэння сацыяльнай рэкламы павінна стаць прымяненне адзінага (цэнтралізаванага) падыходу і ўдзел прафесійных рэкламных агенцтваў. Усё гэта падрабязна выкладзена ў распрацаванай АРА і прапанаванай да разгляду канцэпцыі «Аб сацыяльнай рэкламе», удакладняе сваю пазіцыю кіраўніцтва асацыяцыі.

**У якасці экспертаў**

Асацыяцыя рэкламных арганізацый таксама прапануе дзяржаве сваю дапамогу ў стымуляванні маркетынгавай дзейнасці прадпрыемстваў па ключавых галінах і гатовая на бясплатнай аснове падаваць МАРГу аналітычныя даныя па сегментах два разы на год. Спецыялісты АРА могуць таксама выступаць з экспертнымі ацэнкамі па кожнай катэгорыі, даваць практычныя рэкамендацыі канцэрнам і асобным вытворцам.

Гэтыя прапановы паспрыяюць аздараўленню бізнес-асяроддзя ў сферы рэкламы, аднаўленню разумных і рацыянальных праваадносін, аптымізацыі працэсаў вытворчасці і размяшчэння рэкламы, а таксама павышэнню даходнасці ад рэалізацыі рэкламных праектаў, упэўнены спецыялісты асацыяцыі ■

# Здаеш кватэру — падлічы «навар» за год

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тут эксперты міністэрства ўдакладняюць, што пры атрыманні на працягу 2011—2016 гадоў даходаў ад продажу аднаго наймення аб'екта нерухомасці (напрыклад, у 2014 годзе — адной кватэры, а ў 2016 годзе — аднаго жылога дома) фізічная асоба вызваляецца ад падачы падатковай дэкларацыі (разліку), бо такія даходы вызваляюцца ад падаходнага падатку.

Увогуле не існуе колькаснай падатковай льготы на продаж аб'ектаў нерухомасці, якія не адносяцца да кватэры, жылога дома з гаспадарчымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), дачы, садовага доміка, гаража, машына-месца і зямельнага ўчастка. Калі ўласнік прадаў нават адзін такі аб'ект камерцыйнай нерухомасці, тады ён абавязаны запоўніць дэкларацыю. Да такіх аб'ектаў, напрыклад, належаць гандлёвыя, офісныя і адміністрацыйныя памяшканні.

І ў гэтым выпадку існуе выключэнне з правілаў, калі нерухомая маёмасць была атрымана ў спадчыну. Атрымліваецца, што прадаваць у кароткі тэрмін можна любую колькасць машын, дамоў, дач ці зямельных участкаў і іншую нерухомасць, калі ўсё гэта было атрымана ў спадчыну. І галоўнае, што падаваць дэкларацыю і плаціць падаткі ў гэтым выпадку не трэба незалежна ад перыядычнасці іх адчужэння на працягу пяцігадовага перыяду.

## Падлічваем падарункі

Падлічваць за год трэба і тыя даходы, якія былі атрыманы ад продажу ці іншага выплатнага адчужэння долі (паю, часткі долі або паю) у статутным фондзе арганізацыі іншай фізічнай асобе. Тут без варыянтаў. Іншая справа — падарункі.

Калі чалавек летась атрымліваў даходы ў выглядзе дарэння ад фізічных асоб, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у памеры, большым за 4 947 рублёў ад усіх крыніц на працягу года, тады без дэкларацыі яму не абысціся. Падаткаабкладанню падлягае менавіта сума такога перавышэння. У гэтым выпадку падлічваецца не толькі сума грашовых падарункаў, але ўлічваецца і кошт іншай маёмасці, у тым ліку нерухомай.

Выключэнне складаюць выпадкі атрымання даходаў ад асоб, якія знаходзяцца паміж сабой у адносінах сваяцтва. Менавіта тады падобныя падарункі вызваляюцца ад падаходнага падатку незалежна ад памеру атрыманага ў выніку дарэння даходу.

Увага! Асобамі, якія знаходзяцца ў адносінах блізкага сваяцтва, лічацца бацькі (усынавіцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя, удачароныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабуля, унукі, прадзед, прабабуля, праўнукі, муж і жонка. У адносінах сваяцтва будуць блізкія сваякі мужа або жонкі, у тым ліку памерлых.



## Даход ад арэнды лепш падлічыць да капейкі

Гэта тычыцца тых кліентаў інспекцый, хто летась здаваў сваю ўласную кватэру на працяглы тэрмін і плаціў фіксаваны падатак. Цяпер яны павінны падлічыць гэты даход ад здымнага жылля за ўсе 12 месяцаў. Калі такія даходы ад здачы ўнаём жылых і нежылых памяшканняў дасягнулі агульнай сумы 4 947 рублёў і больш, тады трэба наведваць падатковую інспекцыю. Потым такія даходы абкладаюцца падаходным падаткам па стаўцы 13 працэнтаў. Пры гэтым сумы падаходнага падатку ў фіксаваных сумах, выплачаныя за 2016-ты, падлягаюць заліку пры вылічэнні падатку па стаўцы 13 працэнтаў.

Напрыклад, у прэс-службе МПЗ падлічылі, што пры атрыманні агульнага даходу за здачу аднапакаёвай мінскай кватэры ў памеры 6000 рублёў дадатковы аб'ём падаходнага падатку па пададзенай дэкларацыі складзе каля 550 рублёў. І гэтую суму ўласніку жылля лепш падлічыць да першых дзён вясны і заплаціць добраахвотна да 15 мая, бо інакш канчатковыя сумы выдаткаў будуць у разы большыя.

Сума падаходнага падатку ў гэтым прыкладзе да даплаты падлічваецца так:

780 рублёў — 231 рубель = 549 рублёў.

Тут 780 рублёў — сума падаходнага падатку, вылічаная па стаўцы 13 працэнтаў, а 231 рубель — агульная сума падаходнага падатку ў фіксаваных сумах, выплачаная за 2016 год.

## Заробкі з-за мяжы

Эксперты падатковай галіны асобна адзначаюць, што абавязкова дэкларуюцца любыя даходы, што былі атрыманы падаткаплацельшчыкамі за мяжой і (або) з-за мяжы нашай краіны.

Гэта могуць быць грошы ад працы па найме (кантракце), даходы ад продажу акцый або іншых каштоўных папер, ад продажу доляў у статутных фондах замежных арганізацый, у выглядзе працэнтаў па рахунках (укладах) у замежных банках, атрыманыя ў дар ад замежных грамадзян і інш.

Фактычна выплачаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы сумы падатку з даходаў, атрыманых у такой замежнай дзяржаве (за выключэннем даходаў, атрыманых з афшорных зон), падлягаюць заліку пры вызначэнні сумы падаходнага падатку, які налічваецца падатковым органам Беларусі на падставе падатковай дэкларацыі. Тут існуе адзін нюанс. Такі залік ажыццяўляецца работніку пры ўмове прадстаўлення дакумента аб атрыманым даходзе і ўтрыманым падатку, пацверджаным падатковым або іншым кампетэнтным органам замежнай дзяржавы.

Такое пацвярджэнне даецца фізічнай асобай альбо ў момант падачы падатковай дэкларацыі (разліку), альбо на працягу аднаго года з дня падачы заявы аб правядзенні заліку падатку, які быў аплачаны ў бюджэт замежнай дзяржавы.

## Пры спыненні будаўніцтва і пагашэнні жыллёвых аблігацый

Па выніках года дэкларуецца і даход, атрыманы грамадзянінам праз механізм вяртання раней унесеных сродкаў пры спыненні будаўніцтва жылля, а таксама ў выпадку патанення такога будаўніцтва альбо ў выпадку выбыцця фізічнай асобы з членаў арганізацый забудоўшчыкаў.

Тут спецыялісты падатковай галіны адзначаюць, што вернутыя пры гэтым грашовыя сродкі, у тым ліку паявыя ўзносы, падлягаюць падаткаабкладанню падаходным падаткам у выпадку, калі на такія ўзносы раней быў прадастаўлены маёмасны падатковы вылік. У гэтым выпадку фізічная асоба, якой у 2016 годзе былі вернуты названыя вышэй грашовыя сродкі, абавязана падаць у падатковы орган падатковую дэкларацыю і заплаціць падаходны падатак у дачыненні да сум, на якія ёй раней была дадзена льгота па падаходным падатку ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

Трэба дэклараваць таксама і даходы, што былі атрыманы ў выглядзе грашовых сродкаў пры пагашэнні (датэрміновым пагашэнні) жыллёвых аблігацый, а таксама ў выглядзе вяртання грашовых сродкаў, унесеных у аплату кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, у выпадку невыканання забудоўшчыкам абавязацельстваў па дагавору. Дэкларацыя тут падаецца ў тым выпадку, калі па такіх унесеных сумах для набыцця жыллёвых аблігацый раней быў прадастаўлены маёмасны падатковы вылік.

Такім чынам, былы забудоўшчык, які атрымаў летась такія грашовыя сродкі, абавязаны падаць у падатковы орган падатковую дэкларацыю і заплаціць падаходны падатак у дачыненні да сум, на якія яму раней была прадастаўлена льгота па падаходным падатку ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

## Падатковыя вылікі

Падатковую інспекцыю можна наведваць не толькі, каб пакінуць там грошы. Калі чалавек пераплаціў падаходныя падаткі за мінулы год, то праз інспекцыю гэтыя грошы ён можа яшчэ вярнуць. У гэтым выпадку дэкларацыю аб даходах за год падаюць тыя грамадзяне, якія маюць права на атрыманне падатковых вылікаў (сацыяльных, маёмасных і прафесійных), пры ўмове, што абавязак па прадастаўленні такіх вылікаў грамадзянам ускладзены на падатковыя органы. Вяртанне падатку ажыццяўляецца на працягу 30 дзён з моманту падачы фізічнай асобай адпаведнай заявы. Звычайна такія вылікі атрымліваюць работнікі па месцы асноўнай працы. Увогуле ўзор формы падатковай дэкларацыі аб даходах за год можна знайсці на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах (www.nalog.gov.by).

## Лепш не забывацца

Парушэнне фізічнай асобай тэрміну прадстаўлення ў падатковы орган (да 1 сакавіка) падатковай дэкларацыі за 2016 год цягне накладанне штрафу ў памеры 2 БАЗАВЫХ ВЕЛІЧЫНЬ з павелічэннем яго на 0,5 базавай велічыні за кожны поўны месяц пратэрміноўкі, але НЕ БОЛЬШ 10 базавых велічынь.

Даведачна, з 1 студзеня 2017 года памер базавай велічыні складае 23 рублі. Такім чынам, памер штрафу складзе ад 46 да 230 рублёў.

Пры парушэнні тэрміну выплаты падаходнага падатку (да 15 мая), вылічанага на падставе прадстаўленай падатковай дэкларацыі за 2016 год, калі незаплачаная або няпоўнасцю заплачаная сума падатку перавышае адну базавую велічыню, цягне накладанне штрафу ў памеры 15% ад няявыплачанай сумы падатку, але не менеей 0,5 базавай велічыні. Такім чынам, памер штрафу складае ад 11,5 рубля і больш.

## Гэта сур'ёзна

Дэклараваць свае даходы па выніках года павінны і тыя грамадзяне, у каго ўтрыманне падатку з такіх сум не прадугледжана падатковымі агентамі — арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Дэкларацыю аб даходах і маёмасці могуць патрабаваць у любога грамадзяніна ў тым выпадку, калі ў падатковай інспекцыі ўзнікнуць пытанні аб тым, за якія даходы была набыта тая ці іншая маёмасць. А вось тэрміну даўнасці па падатковых парушэннях не існуе. Як правіла, праверкі ажыццяўляюцца за апошнія 10 гадоў. Мне здаецца, што лепш такіх праверак не чакаць.

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ. kurkach@zviazda.by

■ Інавацыі

# ЗАХАВАЕМ ЦЯПЛО І ГРОШЫ

## Сёлета ў Гродне з'явіцца энергаэфектыўны дом другога пакалення

**Зіма — час плаціць за ацяпленне. Для многіх гэты пункт у «жыроўцы» значна павялічвае выдаткі на камунальныя паслугі. Але ці магчыма ўзімку жыць у камфортных умовах і не плаціць за цэнтралізаванае ацяпленне? «Так!» — адказваюць жыхары энергаэфектыўных дамоў. Як працуюць гэтыя будынкі, нам расказаў галоўны інжынер Інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Рышард КАЦЫНЕЛЬ.**



### Жыць з розумам

Гродзенскі дом другога пакалення будзе браць цеплыню ад грунту — праз палі, ад каналізацыйных сцёкаў — праз цеплавыя помпы, а яшчэ выкарыстоўваць рэкуперацыю (вяртанне часткі цеплыні) і энергію сонца. Пры гэтым дом спланаваны такім чынам, каб у яго не было лішніх вуглоў. У выніку ўсіх гэтых мерапрыемстваў спажыванне цеплавой энергіі, згодна з разлікамі, зніжаецца да 15 кВт•г/м². Гэта азначае, што ён самастойна забяспечвае абагрэў нават пры тэмпературы паветра -7 °С. Рышард Кацынель гаворыць, што дом, які зараз стаіць у Гродне, таксама вызначаецца якасцю:

**Наша тарыфная палітыка не ідзе на руку развіццю будаўніцтва энергаэфектыўных дамоў. Нам патрэбна служба пры Савеце Міністраў, якая цэнтралізавана займалася б разлікамі.**

— Наш інстытут ужо больш за дзесяць гадоў займаецца мерапрыемствамі па энергазберажэнні. І менавіта ў Гродне збудавалі другі пасля Мінска больш тэхнічна праграмы 69-кватэрны дом з механічнай вентыляцыяй. Цэнтралізаванае ацяпленне амаль не выкарыстоўвалася ні ў снежні, ні ў студзені, а працавала фактычна толькі ў лютым. Пры гэтым больш за 80% цеплыні вентыляцыйнага паветра вярталася ў кватэру праз рэкуператары. Наш дом паказаў найлепшыя вынікі і добра зарэкамендаваў сябе ў эксплуатацыі. Калі гаварыць пра нейкія недахопы, трэба разумець, што такі дом важна правільна выкарыстоўваць. І да кватэры падыходзіць з розумам. Мы праінструктавалі сваіх супрацоўнікаў, якія засяляліся ў гэты дом, як карыстацца такімі кватэрамі.

У Беларусі цяпер пабудавана 18 энергаэфектыўных дамоў. Гэта дамы-лабараторыі, у якіх інжынеры эксперыментуюць з тэхналогіямі і такім чынам выбіраюць найлепшыя рашэнні для ўкаранення ў масавым будаўніцтве жылля. **Сяргей ЦЕРАХАЎ, кандыдат тэхнічных навук, загадчык навукова-даследчага і праектна-канструктарскага аддзела энергаэфектыўных тэхналогій у будаўніцтве Інстытута жылля — НДПТІБ імя Сяргея Атаева**, расказаў пра асаблівасці іх выкарыстання.

### Галасуем рублём

Тарыфы на аплату жыллёва-камунальных паслуг паступова растуць, а гэта значыць, што ўжо сёння мы павінны клапаціцца пра тое, у якой кватэры будзем жыць заўтра. Ідэя развіцця энергаэфектыўнага будаўніцтва ў нашай краіне на ўзроўні пілотных праектаў з'явілася ў пачатку 1990-х гадоў. Спярша пад энергаэфектыўным домам разумелі той, які спажывае не больш за 60 кВт•г/м² цеплавой энергіі на ацяпленне і вентыляцыю, потым гэты паказчык знізілі да 40 кВт•г/м². «Каб не было разыходжання, па прапанове нашага інстытута прынятая такая тэрміналогія: энергаэфектыўны жылы дом — дом адпаведны па ўзроўні ўдзельнага расходу цеплавой энергіі на ацяпленне і вентыляцыю класу В, А і А+, — тлумачыць Сяргей Церахаў. — Гэта ракіроўка для карыстальніка, каб было зразумела, 40 кВт•г/м² — гэта шмат ці не. Цяпер мы не маем права ні праектаваць, ні будаваць будынкі класа, ніжэйшага, чым В». Усе разлікі ідуць, прымаючы пад увагу сацыяльны нарматыў тэмпературы паветра — 18 градусаў, але цяпер у стадыі ўзгаднення ініцыятыва павысіць стандарт да 20 градусаў. Мы можам сабе дазволіць такую тэмпературу.

У нас ужо адпрацаваны інжынерныя сістэмы, якія дазваляюць павысіць энергаэфектыўнасць будынкаў да класаў А і А+ у галіне ўтылізацыі цеплыні выдаленага з памяшканняў паветра. У планах працаваць з сістэмай утылізацыі сцёкавых вод і выкарыстаннем аднаўляльных крыніц энергіі. «Па вялікім рахунку, тое, што мы робім сёння, — гэта адпрацоўка тэхналогіі, — працягвае Сяргей Церахаў. — Калі наступіць момант заплаціць за камунальныя паслугі ў поўным аб'ёме, адны могуць «адстрэльвацца» ад тарыфаў. А іншыя не». Кошт увядзення сістэмы рэкуперацыі складае ад 6 да 12% ад кошту дома ў залежнасці ад канструкцыйнай сістэмы будынка. Але ўзнікае іншая праблема: электрычнасць зараз каштуе нашмат больш за цеплавую энергію, а калі праекціроўшчыкі пачыналі рабіць гэтыя дамы дзесяць гадоў таму, сітуацыя з тарыфамі была супрацьлеглая. Тады была мэта перш за ўсё эканоміць цеплавую энергію.

Рышард Кацынель пры гэтым адзначае, што «наша тарыфная палітыка не садзейнічае на руку развіццю будаўніцтва энергаэфектыўных дамоў. Сёння мы плацім за электрычнасць амаль па сабекошце, а за цеплавую энергію — значна менш, астатнюю частку пагашае дзяржава. Раней сітуацыя была супрацьлеглая. Цяпер траціць энергію на работу рэкуператара не выгадна. Сённяшняя тарыфная палітыка — бар'ер для развіцця гэтага кірунку. Адпаведнае пытанне ўзнімалася неаднаразова. На мой погляд, нам патрэбна служба пры Савеце Міністраў, якая цэнтралізавана займалася б разлікамі. Перадавыя ідэі па ўцяпленні дамоў трэба рухаць наперад. Ужо цяпер дамы, якія будуюцца, выкарыстоўваюць энергіі амаль у чатыры разы менш, чым звычайныя панельныя».

### Крокі наперад

Праграму развіцця энергаэфектыўнага будаўніцтва ў нашай краіне падтрымлівае ПРААН. Гэты праект мае адны і тыя ж складнікі ва ўсіх краінах СНД і Еўропе — павышэнне энергаэфектыўнасці жыллёвага фонду, але кожная краіна ў яго межах робіць сваё. Першы ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў энергаэфектыўны 145-кватэрны 9-павярховы жылы дом пабудаваны ў 2007 годзе ў Мінску. Зараз мы пераходзім на якасна іншы ўзровень і ідзём наперадзе.

У першым будынку ў сталіцы былі зроблены цёплыя сцены за кошт змены эфектыўнасці ўцяпляльніка ў панэлі. А потым былі зменены і нарматыўныя акты па супраціўленні агараджальных канструкцый, згодна з якімі пасля 2009 года ўсе жылыя дамы будуюцца больш цёплымі. Там жа апрабавалі гарызантальную сістэму ацяплення з пакватэрным улікам і рэгуляваннем.

У гродзенскім доме зрабілі шахту паветразаборніка з чацвёртага паверха, бо ў горадзе ёсць дзве зоны забруджвання. Да трэцяга паверха — загазаванасць і пыл. Вышэй за дзявяты — прамысловыя выкіды. «Людзі адзначаюць, што ў іх кватэрах цудоўнае чыстае паветра. У звычайных дамах жыхары скардзяцца на цвіль і кандэнсацыю. У нас такіх праблем няма. Тэмпература рэгулюецца ўнутры памяшкання. Пры гэтым механічная вентыляцыя дае паветра нармальнай вільготнасці», — тлумачыць Рышард Кацынель. Прадстаўнікі Інстытута жылля — НДПТІБ імя Сяргея Атаева праводзілі ананімнае анкетаванне і кантралявалі сістэму дыспетчарызацыі інжынернага абсталявання. У выніку быў атрыманы станоўчы адказ (пад 90%) на пытанні, ці задавальняе людзей якасць паветра ў жылых памяшканнях, ці камфортна ім пражываць.

**Калі б у Гродне ўцяплілі ўсе дамы старога жылога фонду, то не прыйшлося б будаваць ГЭС на Нёмане. Гэта было б танней.**

— Тэмпература цепланосьбіта ў сістэме ацяплення павінна забяспечваць камфортныя ўмовы для пражывання, — расказвае Сяргей Церахаў. — Прычым у такі дом мы тэмпературу на сем градусаў ніжэй запускаем, а ў кватэрах усё роўна цёпла. Можна было б яшчэ зніжаць, але ўзніклі сітуацыі, калі прыходзіць у таварыства жыхар і кажа, што ў яго батарэі халодныя. Там аўтаматыка кіруе, і, калі тэмпература паднімаецца вышэй, чым чалавек наладзіў, падача цяпла спыняецца. У яго пытаюцца: а ў вас холадна ў кватэры? Ён адказвае: не, горача, але батарэя павінна быць цёплай. Трэба, каб людзі разумелі, што крытэрый цяпла — гэта не гарачая батарэя, а цеплыня ў доме.

**У звычайных дамах жыхары скардзяцца на цвіль і кандэнсацыю. У нас такіх праблем няма.**

Дзяржава павінна быць зацікаўлена ў эканоміі паліва ў сістэме ЖКГ. У Беларусі жылы фонд складае 273 млн м², з іх 190 млн м² — старыя будынкі. Па падліках Рышырда Кацынеля, калі б у Гродне ўцяплілі ўсе дамы старога жылога фонду, то не прыйшлося б будаваць ГЭС на Нёмане. Гэта было б танней.

Што да дыспетчарызацыі, у Беларусі вельмі добрая сітуацыя. Цяпер ідзе работа над тым, каб цалкам ахапіць жылы фонд сістэмай дыстанцыйнага збору інфармацыі аб рабоце інжынернай сістэмы на ўзроўні дамоў. На ўзроўні цеплавых пунктаў гэтыя задачы вырашылі яшчэ 15 гадоў таму.

### Чалавек — чалавеку

— Для індывідуальнага жылля лепш сістэма дэцэнтралізавана. Хачу ўключу — хачу выключу. Калі будынак арэндны — там лепш зрабіць цэнтралізаваную сістэму і ўжо жыхару прапаноўваць набор паслуг, — гаворыць Сяргей Церахаў. — Цяпер будуць праектавацца пілотныя будынкі з электраабаграваннем. Магчымы розныя падыходы: з воднай сістэмай, канвектарам, камбінаваны.

Перад жыхарамі энергаэфектыўных дамоў паўстаюць новыя праблемы. Напрыклад, выкарыстанне індывідуальных лічыльнікаў спажывання цеплавой энергіі. Праверка іх каштуе вельмі вялікіх грошай нават з улікам таго, што рабіць гэта трэба праз 4—6 гадоў. Ёсць прапанова, каб кошт абслугоўвання гэтых прыбораў быў уключаны ў кошт тэхабслугоўвання будынка. Тады б, як заўраз лічыльнікі вады, іх бы правяралі бясплатна.

Акрамя гэтага, ёсць праблема з тым, што вялікі працэнт жыхароў не ўжываюць цеплавой энергіі наогул. Гэта атрымліваецца з-за таго, што адзін паставіў сабе 22 °С, а сусед — 18 °С. У гэтага суседа батарэі «зачыніліся». А першы жыхар павінен сабе нагрэць да 22 і аддаць яшчэ суседу, таму штоператокі цяпла ніхто не адмяняў. Выйшлі з сітуацыі проста: калі ў цябе ноль, плаціш па сярэднім.

— Мы распрацавалі сістэму па ўліку цеплавой энергіі, якая працуе з тэмпературай паветра ў памяшканні. Не важна, адкуль ты бярэш цяпло: ад суседа ці ад батарэі — заплаціш па той тэмпературы, якая ў цябе ў кватэры. Зараз гэтая тэхналогія ў трох дамах будзе абкатаная, і мы зможам параўнаць даныя, — тлумачыць Сяргей Церахаў.

Дамы будуюцца на 50—100 гадоў. Сёння ў інстытуце НДПТІБ з падтрымкай Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь вядуцца работы, над такімі канструкцыйнымі сістэмамі, якія далі б жыхару магчымасць усталяваць энергаэфектыўныя прылады тады, калі ў яго ўзнікне такая патрэба. Тое ж самае для будынкаў на ўзроўні таварыства. Калі яны адчуюць неабходнасць павысіць энергаэфектыўнасць, іх штаты цеплапункт ужо загадзя будзе для гэтага прыстасаваны.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
anisovich@zviazda.by

■ Тэхналогіі будучыні

# LTE ўжо ў рэгіёнах

## Мабільная сувязь чацвёртага пакалення — ва ўсіх абласных цэнтрах

**Першымі сярод жыхароў гэтых населеных пунктаў адчуць перавагі высокахуткаснага мабільнага інтэрнэту ўжо змаглі абаненты МТС. Хутка паслуга стане даступнай больш як для трыццаці гарадоў. Пра гэта расказаў генеральны дырэктар кампаніі beCloud Сяргей ПАБЛАГУЕЎ. У перспектыве 4G-сувязь з'явіцца ва ўсіх раённых цэнтрах краіны. Прадстаўнікі beCloud абяцаюць, што па якасці і хуткасці сувязь у рэгіёнах не будзе саступаць сталіцы, дзе тэхналогія LTE Advanced з'явілася яшчэ год таму.**

Такім чынам, сувязь чацвёртага пакалення з пачатку года стала даступнай 5,5 мільёна беларусаў — гэта 75 працэнтаў гарадскога насельніцтва краіны.

— Менш чым за год мы пабудавалі сетку, якая дасць магчымасць карыстацца тэхналогіяй LTE Advanced ва ўсіх рэгіёнах краіны, — сказаў Сяргей Паблагуеў. — Штотыдзень фіксуецца рост цікавасці карыстальнікаў да хуткасцяў сувязі чацвёртага пакалення. Колькасць абанентаў мабільных апаратаў павялічваецца, адпаведна, расце нагрузка на сетку. Менавіта таму beCloud палепшыў прапускную здольнасць LTE-сеткі ў сталіцы на 40 працэнтаў. Акрамя таго, праведзена работа па ўдасканаленні пакрыцця ў шэрагу праблемных месцаў.

Пра тое, што высокахуткасны інтэрнэт запатрабаваны жыхарамі краіны, сведчаць словы **генеральнага дырэктара мабільнага аператара МТС Уладзіміра КАРПОВІЧА**. Паводле яго звестак, у лістападзе 2016-га аб'ём трафіку, спажытага карыстальнікамі LTE, перавысіў аналагічны паказчык па 3G на 50 працэнтаў. Пры гэтым сувяззю чацвёртага пакалення карыстаецца 170 тысяч жыхароў Мінска — гэта 26 працэнтаў сталічных абанентаў. З моманту запуску LTE-сеткі ў снежні 2015-га доля смартфонаў з падтрымкай гэтай тэхналогіі вырасла больш чым удвая.

Сёлета Беларусь заняла 31-е месца сярод 175 краін свету па індэксе развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Па гэтым паказчыку сярод краін былога СССР мы саступаем толькі Эстоніі. Ужо ў 2017 годзе beCloud плануе сумесна з вядучымі тэлекамунікацыйнымі вытворцамі прыступіць да развіцця наступнага пакалення сувязі — 5G, што забяспечыць максімальна магчымую на сёння хуткасць мабільнага інтэрнэту. Стандарты сувязі пятага пакалення яшчэ знаходзяцца ў распрацоўцы. Мяркуецца, што ў шырокае карыстанне па ўсім свеце яны ўвойдуць толькі ў 2020 годзе.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
lyskavets@zviazda.by

# Каўчэг для адзінокіх

## НОВЫ ДОМ

«Трэба жыць! І жыць добра!» — такія словы часта гучаць у доме-інтэрнаце для ветэранаў вайны і працы «Світанак». Працаваць з пажылымі людзьмі няпроста, асабліва калі ў многіх з іх свой боль, страты, трагедыі. Кожнаму — свой падыход. Кагосьці трэба тармасіць, а іншым лепш не перашкаджаць.

— У асноўным у нас пражываюць людзі, якія ўсё жыццё былі адзінокімі альбо страцілі блізкіх, прайшлі нейкія выпрабаванні. Ёсць і тыя, каго сыны ўладкавалі дзеці, якія не могуць удзяліць ім шмат увагі, таму што занятыя, напрыклад, часта выязджаюць у працяглыя камандзіроўкі альбо наогул пражываюць за межамі Беларусі. Зусім кінутых, як бывае ў іншых інтэрнатах, у нас няма, — расказвае **дырэктар «Світанка» Алена ВАРЫВОНЧЫК.** — З гадамі людзі страчваюць пэўныя навыкі, не могуць сябе абслугоўваць. Дзеці пачынаюць хвалявацца, ці змогуць старыя прыгатаваць ежу, ці выключаць пліту, ці прымуць своечасова лекі. І вырашаюць, што патрэбны нехта, хто б бабулям і дзядулям дапамагаў.



Нястомная працаўніца Тацццяна Тарасаўна МІЦЬКО.

Адаптацыя адбываецца па-рознаму. Адны хутка прызвычайваюцца і адразу хочуць з усімі знаёміцца. Другія могуць на некаторы час закрыцца. Напрыклад, ёсць у «Світанку» дзядуля-маўчун, вельмі інтэлігентны, аматар класічнай музыкі. Вясной, летам тут выстаўляюць на вуліцы калонкі, уключаем музыку. Няяк паставілі класічную. Усе разышліся па альтанках, разбрыліся па парку, а ён сядзіць замілаваны, слухае, для яго гэта такая асалода...

Для адзінокіх інтэрнат — новая сям'я, некаторыя старыя сюды прыходзяць самі. Многія завуць гэты прыстанак санаторыем. Тут чатырохразовае харчаванне. Ці кожны б сабе так гатаваў? Ёсць у інтэрнаце і кухні, дзе можна прыгатаваць тое, што падабаецца. Дарэчы, на іх гаспадынькі часам нават кулінарныя паядынкі ладзяць, гатуюць бліны, выпякаюць пірагі. Пасля рамонту з'явілася кухня-студыя — сапраўдны пакой адпачынку, з шыкоўным дэкаратыўным пано на ўсю сцяну, тэлевізарам, адзін з банкаў выдзеліў грошы і на сучаснае кухоннае абсталяванне. Тут можна па-дамашняму сустрэць гасцей, адзначыць святы, ці нават проста сабрацца, пачаяваць.

Тут усе на віду: калі хто занядужыць — адразу заўважаюць і суседзі, і персанал. Але ніхто не будзе перашкаджаць тым старым, якім хочацца пабыць сам-насам. У пакойчыках пражывае па адным-два чалавекі. Гэта як міні-кватэркі з неабходнай мэбляй — ложкамі, тумбачкамі, сталамі, шафамі і паліцамі, якія людзі могуць абстаўляць на свой густ. Многія захоўваюць старыя звычкі, а хтосьці знаходзіць зносіны, якіх так не хапала ў «вялікім свеце». Тут заводзяць сяброў і не толькі.

## СЯМЕЙНЫЯ САКРЭТЫ

Бабулі і дзядулі на спатканні бегаюць і часам саромеюцца гэтага, як юнакі.Так, адну парачку заўважалі на лавачцы на прыпынку, старыя сядзелі і трымаліся за рукі; другая хадзіла да возера, што знаходзіцца недалёка ад інтэрната. У такіх мясцінах хочацца забыцца пра ўсё дрэннае, сама прырода расслабляе, настройвае на пазітыў, навявае думкі аб прыгожай старасці.

Тут свой свет, свае абмеркаванні. Любяць старыя глядзець ток-шоу, пасля прагляду заўсёды разгараюцца дыскусіі. Засядаць можна і ў бібліятэцы, дзе чытаюць і тэлевізары глядзяць, у даміно гуляюць, выходзяць у інтэрнэт.

Многія знаходзяць, як сябе рэалізаваць. Хтосьці дзеліцца цяплынёй і клопатам, імкнецца ўсім дапамагаць. Ёсць пара, што на працягу многіх гадоў разам, дзе мужчына дапамагае жанчыне даглядаць сябе: такая вось лебядзіная песня. А часам і жанчыны бяруць апеку над дужым полам. Так, адна паненка кружыцца над суседам, сочыць, каб ён не спазніўся на сняданак, каб своечасова прыняў таблеткі. Нехта раскрываецца творча. Не перастае пісаць праваслаўны пісьменнік Барыс Ганага. Ён дзякуе Богу, што трапіў сюды: усё ж добрыя людскія адносіны і цудоўная прырода дадаюць моцы, дапамагаюць аднавіцца пасля інсульту. Душэўна прайшоў літаратурны вечар, на якім адна з бабуль чытала свае вершы, на бенефіс пастараўся з Рыгі прыехаць сын з вялізным букетам.

Ды і добрых людзей, што не забываюцца пра старых, багата. З канцэртамі прыязджаюць дзеці, да нагодніх свят школьнікі нават вырасцілі бабулям у падарунак маленькія фіялачкі. Быў і духавы аркестр — ну як з яго прыездам не згадаць маладосць! Асабліва хваляваліся, прыбіраліся жыхары інтэрната, калі сюды прыязджаў Прэзідэнт.

І ў гэтыя навагоднія святы сівыя «дзяўчаткі і хлопчыкі» , а менавіта так завуць жыльцоў у «Світанку», атрымалі салодкія падарункі. Дарэчы, сярэдні ўзрост тых, хто знайшоў тут прытулак, — 87 з паловай.

— Мне не хочацца называць іх старымі, — дзеліцца дырэктар. — Пра старэйшых кажу «мае старцы» — гэта ж мудрасць, дабрыня, цярпення, вялікі вопыт. У многіх цікавы лёс. Ёсць у нас і дзядуля, які 3 ліпеня 44-га на першым танку з двума гвардзейскімі сцягамі вызваляў Мінск.

## НА ПРАЦУ

— Заўсёды кажу, што мне не падабаюцца словы «дом-інтэрнат», з імі звязваюцца вельмі цяжкія асацыяцыі. Нам больш падыходзіць назва пансіянат, дзе можна адчуць цяпло, утульнасць, дабрыню, — заўважае Алена Варывончык. — Думаю, што ўсе, хто жыве ў нас, удзячны дзяржаве за клопат і ўвагу. Я хачу, каб людзі памяталі, што гэта іх дом, ды яны самі стараюцца зрабіць яго больш утульным, сцены заўсёды ўпрыгожаны іх работамі. У нас ёсць свая майстэрня, мужчыны могуць папрацаваць за станкамі, а жанчыны вяжуць, шыюць, робяць аплікацыі на тканіне, ды чаго толькі не прыдумляюць!

Працатэрапія таксама лечыць, дапамагае аднавіць страчаныя за час хваробы навыкі. Так, ва ўстанову трапіла жанчына, якая перанесла два інсульты. Рукі яе не слухаліся. Спачатку ёй далі скрынку з неапрацаваным бурштынам, і яна перабірала маленькія сонечныя каменьчыкі. Пасля паспрабавала валяць. Паступова аднаўляўся моўны апарат. І ўжо яна ўзялася за спіцы і шыдэлак. Навязала квадратаў, з якіх зробіць стракаты плед.

— Наш пазітыўчык, усіх дзяўчат падтрымлівае. І самы галоўны працаўнік. Бывае, часам хандрыць, але хутка бярэ сябе ў рукі, — прадстаўляюць мне Таццяну Тарасаўну Міцько.

— Я прыехала сюды пасля аперацыі, два месяцы нічога ў рот не магла ўзяць, мне нават вада была горкая. Была я худая-худая, рука мая не працавала. Баялася куды-небудзь выбрацца. А сёння ўжо сама з ложка ўстаю і куды хочаш заеду. Абслугоўванне тут цудоўнае, я чысценькая, дагледжаная, тут і мыюць. А дабрыні колькі! Я шмат у бальніцах паляжала, а такіх цудоўных людзей не сустракала... У інтэрнэце чытала, як адкрываліся такія ўстановы для пажылых. Тады яшчэ з дзвюма нагамі была, падумала, калі што са мной здарыцца, пайду толькі ў гэты дом. А як нагу аднялі, вырашыла: толькі ў «Світанак», ні за што не застануся ў кватэры, там ні прыстасаванняў, нічога няма. Як прыехала, мне адразу ўсё спадабалася. Ні разу не пашкадавала... Вось зараз на працу збіраюся, — расказвае бабуля.

## АЛЬТЭРНАТЫВА

На Міншчыне апрабоўваўся праект, згодна з якім бабулі і дзядулі (у эксперыменце ўдзельнічалі людзі, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту і не мелі ў сталіцы сваякоў, якія па законе абавязаны іх утрымліваць) маглі перадаць сваё жыллё ў абмен на поўнае дзяржзабеспячэнне. Прычым прапаноўваліся розныя варыянты. Так, рэнтнікі маглі разлічваць на догляд дома (сацработнікі прыходзяць пяць разоў на тыдзень), з бюджэту аплачваецца камуналка. Некаторыя састарэлыя (у тым ліку і сямейныя пары) вырашылі абмяняць кватэру на пражыванне з кругласутачным доглядам і абслугоўваннем у доме-інтэрнаце «Світанак». Ва ўсіх удзельнікаў праекта захоўвалася пенсія і штомесяц яны атрымлівалі рэнтныя платы. Плануецца такую практыку працягнуць і ў найбліжэйшым часе распачаць і ў іншых рэгіёнах краіны.



Святочная варта сустракае гасцей.

Па дагаворы рэнты ў «Світанак» пераехаў Вікенцій Арцёмавіч Страха.

— За 26 гадоў, што адслужыў у арміі, у мяне не было ніводнага спагнання, толькі падзякі, і даслужыўся да падпалкоўніка-інжынера. А ўсё чаму? Не піў, не курыў. Сумленна служыў, — распачынае знаёмства Вікенцій Арцёмавіч. — Разам з жонкай вырашылі абмяняць кватэру на пражыванне тут. Але яна памерла ў 2014 годзе. А я вось застаўся. Тут ужо трэцюю зіму. Мне 88 год пайшоў. Адсюль нікуды і не пайду, для мяне тут усё — лекі, ежа, вопратка — бясплатнае. Адміністрацыя добрая. І прэтэнзій у мяне няма; тут і памыюць, і прыбяруць. Ды і сам, пакуль рукі і ногі працуюць, магу пыласос узяць, пакой пачысціць.

Дзядуля прамаўчаў пра тое, што, калі яго жонкі не стала, гараваў вельмі і нават думаў з'ехаць. Але ўсё ж застаўся... А мо і добра, што яго апошні дом — гэта не бетонная каробка, дзе б ён заставаўся ў шчымлівай цішыні, а такі прыстанак, дзе ёсць з кім перакінуцца словам, дзе можна сустрэць людзей, якія вучаць і вучаць цаніць кожны пражыты дзень.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

WWW.ZVIAZDA.BY
WWW.ZVIAZDA.BY
WWW.ZVIAZDA.BY

■ Зачапіла

Рэверс з сцёва

## Н. ЗІГУЛЯ. «Мішкава справа»

*(«Звязда» ад 27 снежня)*

— Было прыемна даведацца, што на ўзроўні дома-інтэрната ўзнімаюцца такія актуальныя пытанні. Адразу бачна, што тут працуюць неабыякавыя людзі, якія не сядзяць склаўшы рукі. Лічу, што людзям з абмежаванымі магчымасцямі таксама трэба даць шанц быць карыснымі нашай краіне. Хопіць рабіць выгляд, што такіх людзей не існуе, што яны нейкі цяжар для грамадства. Дарэчы, у мяне дома ёсць складны зэдлік, зроблены выхаванцамі Веснаўскага дома-інтэрната. Убачыў на адным з фестываляў і набыў. Вельмі зручная і якасная рэч. Да таго ж з натуральнага дрэва. Памятаю яшчэ той перыяд, калі ў гаспадарчых крамах можна было набыць дробязі, зробленыя на прадпрыемстве для глухіх. Зараз чамусьці яны зніклі з продажу, замест іх прадаецца кітайскі шырспажыў. А гэта ж таксама добрая магчымасць даць зарабіць нашым інвалідам. Цалкам згодны і з тым, што калі рабіць другую групу інваліднасці рабочай, то трэба захаваць і пенсію для гэтай катэгорыі людзей. Яны ў любым выпадку павінны быць сацыяльна абаронены.

**Аляксандр Міхайлавіч ЗЕЛЯНКОЎ,** *Бабруйск.*

## С. БУСЬКО. «Пенсіі працуючых пенсіянераў не зменяцца»

*(«Звязда» ад 27 снежня)*

— Добра, нам павысілі пенсійны ўзрост. «Звязда» ўжо столькі пісала пра дэмаграфічную сітуацыю, што неабходнасць гэтага ўжо стала, напэўна, усім відавочна. Але, як я думаю, разам з гэтым трэба павышаць якасць і даступнасць нашай медыцыны.

У нас, каб трапіць да мамолага, трэба чакаць 3-4 месяцы, аналізы трэба здаваць платна, бо ў паліклініцы няма неабходных рэагентаў... Што часцей за ўсё чуе ад доктара 55-гадовая жанчына ў адказ на свае скаргі? Правільна: «А што вы хочаце ў вашым узросце?» Дык давайце вызначымся: чаго мы чакам ва ўзросце, які прызналі працаздольным? Калі камусьці незразумела, скажу: якаснай і своечасовай медыцыны, каб мець сілы працаваць, а не валяцца на бальнічным.

**М.К,** *г. Мінск.*

## І. СІДАРОК. «Ці можна арэндную кватэру перавесці ў сацыяльную?»

*(«Звязда» ад 28 снежня)*

— Дзяржаўную кватэру робяць камерцыйнай, потым яе пераўтвараюць у сацыяльную. Навошта гэтыя лішнія рухі? Толькі паперу пераводзяць на афармленне дакументаў ды людзей ганяюць па інстанцыях і чэргах. Вядома, што тыя, у каго не было грошай на прыватызацыю, не аформілі яе і раней, не аформілі і зараз. Упэўнены, што далёка не ва ўсіх гэта быў «свядомы» выбар. Тым больш што для складання дагавора патрэбна згода ўсіх, хто жыве ў кватэры. А як жа тыя, хто не змог дамовіцца паміж сабой? Не захацеў даваць грошы на сваю частку, якая яму павінна належаць пры набыцці жылля ва ўласнасць? Ці проста, каб нашкодзіць сямейнікам, адмовіўся падпісаць згоду? У іх цяпер і дома разлад у адносінах, і грошы немаленькія вылятаюць штомесячна. Вось такія, мне здаецца, і ёсць самыя першыя патэнцыяльныя кандыдаты ў бамжы. І куды ім ехаць? Хіба да нас, у вёску.

**Валерый Іванавіч, уладальнік уласнай хаткі,** *Дзяржынскі раён.*

## С. КУРКАЧ. «За цяпло і ў студзені заплацім менш за палову»

*(«Звязда» ад 28 снежня)*

— З новага года пачынаем амаль цалкам плаціць за ваду. Спецыялісты ўпэўнены, што вадзічка зараз робіцца залатой, таму трэба яе максімальна эканоміць. З гэтым пасылам згодзен, але толькі часткова. Зразумела, калі ў кватэры жывуць толькі дарослыя. Напрыклад, у мяне дзве непаўналетнія дачкі, якія часам па паўгадзіны з ванны не вылазяць. Растлумачыць ім пра эканомію вады даволі складана.

Згодны, што падобныя праблемы павінны вырашацца на ўзроўні канкрэтнай сям'і, але я прапаную пра эканомію на бытавым узроўні гаварыць і ў школах. Цяпер пра ацяпленне. У жыроўках гэты радок самы істотны для кашалька. У студзені пачнём плаціць яшчэ больш, не кажучы пра канец наступнага года. З вялікімі тарыфамі можна згадзіцца ў тым выпадку, калі ў людзей ёсць магчымасць памяншаць падачу цяпла ў батарэі. Дарэчы, такія кранікі ў новых дамах ёсць. Аднак у старым жыллі гэта не прадугледжана. Мне здаецца, што спачатку камунальныя службы павінны гэтыя кранікі да ўсіх батарэй «прыляпіць», а толькі потым браць за цяпло ўсе 100%.

**Генадзь Бурына,** *г. Гомель.*

## С. БАРЫСЕНКА. «Адкуль столькі агрэсіі?»

*(«Звязда» ад 28 снежня)*

— Ішлі неяк за мной дзядуля ды, відаць, дзве малыя ўнучкі. Дзеці звярнулі ўвагу на невялікага сабачку, які гуляў з гаспадыняй непадалёк. Выпадкова чую за спінай размову таго дзядулі са сваімі дзяўчаткамі. «Дзеда, а сабачка не кусаецца?» — «Няхай толькі паспрабуе», — адказвае той. «А калі ўсё ж такі ўкусіць?» — не супакойваецца адна малая. «А мы яго заб'ём тады». Я спынілася, павярнулася і сказала, што гаварыць такое і так думаць... Ну, вы мяне разумееце... Як жа так атрымліваецца, што сярод нас ёсць людзі, якія амаль пражылі жыццё, а абсалютна нічога не зразумелі?! Не кранулі іх душу ні думкі, ні гуманныя каштоўнасці, ні сардэчная цеплыня і дабрыня. Мы сапраўды жывём у грамадстве, прасякнутым жорсткасцю і гвалтам. Не падабаецца нешта — значыць, біць, забіваць, вынішчаць... А там жа і пагрозы рэальнай ні кроплі не было. Сабачка — ёркшырскі тэр'ер. Але хоць бы і даберман?!

**Ірына Мікалаеўна,** *г. Маладзечна*



■ Розныя — роўныя

# «Я БАЧУ... У СНЕ»

## Невідушчая дзяўчына расказвае пра свае падарожжы, мары і людскую дапамогу

**«Я бачу сны. Гэта вялікае свята для мяне. Баішся аднойчы забыць твары сваіх родных і сяброў. І вось ноччу бачыш іх у сне... Гэта феерверк эмоцый! Бывае, раніцай прачынаешся ў слязах... І не таму, што шкадуеш сябе, а ад радасці, што хоць бы ў сне можаш іх убачыць. Калі я гутару з людзьмі, заўсёды звяртаю ўвагу на голас. Ён можа многае расказаць пра чалавека...»**
**У 26-гадовай мінчанкі Таццяны Сацук першая група інваліднасці па зроку. Як жывецца гэтай невідушчай маладой дзяўчыне? Хутчэй за ўсё, вы моцна здзівіцеся...**

Звонкі смех за дзвярыма — першае, што мы з фотакарэспандэнтам пачулі, калі прыехалі ў інтэрнат унітарнага прадпрыемства «Святлоприбор» Беларускага таварыства інвалідаў па зроку і ўжо падыходзілі да пакоя, у якім жыве наша гераіня. Нас сустракае грацыёзная худзенькая дзяўчына з шыкоўнымі доўгімі валасамі. У пакоі — ідэальныя чысціня і парадак, поўная адсутнасць рознай драбязы, што зусім не ўласціва маладым дзяўчатам. Нічога не вісіць на сценах, абсалютна пусты стол — аскетычная абстаноўка ў духу такога моднага цяпер мінімалізму.

**«Вельмі хвалявалася перад першым выхадам на сцэну, а калі выйшла — супакоілася. Аказалася, я камфортна сябе адчуваю і не баюся гледачоў».**

— Гэта я проста нікуды не спяшалася! — смяецца Таццяна. — Калі кудысьці спяшаюся, у мяне ўсё лятае! Потым прыходзіш дадому і думаеш: што тут робіць гэтая рэч? А гэтую чаму я сюды кінула?..

— Мае бацькі жывуць у Жодзіне, — працягвае дзяўчына. — А я захацела жыць у Мінску, і ў мяне гэта атрымалася! Бацькі занадта шкадуюць, берагуць, а мне хочацца самастойнасці, хочацца сябе рэалізаваць. У мяне ўсяго толькі няма зроку. Ну і што? Затое ёсць рукі-ногі, я магу хадзіць, умею сябраваць. Я нават неяк хацела скочыць з парашутам, ужо і з інструктарам дамовілася. Але ў апошні момант сяброўкі адгаварылі: «Зробяць аперацыю, тады і скачы, а пакуль не трэба». І я паслухалася.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

* * *

Праблемы з вачыма ў Таццяны пачаліся яшчэ ў дзяцінстве. Яна лячылася, прайшла праз шэраг аперацый... Пасля адной з іх зрок знік зусім. Ёй было тады 18 гадоў, толькі-толькі скончыла школу...

— Пасля гэтага я паступіла вучыцца на масажыста. На практыцы высветлілася, што ад фізічных нагрузак моцна баляць вочы і іх стан пагаршаецца. Прыйшлося кінуць, — успамінае дзяўчына. — Але я такі чалавек, што ніколі не здаюся. Не губляю надзеі і не апускаю рук. Зрабіла аперацыю ва Украіне, пасля якой у мяне з'явілася адчуванне колеру. І яшчэ перыядычна нейкай часткай вока я магу заўважыць абрысы. Але для гэтага трэба, каб супала некалькі ўмоў: я павінна быць не стомленай, пасля сну, а на дварэ — ясная пагода.

У мяне было вельмі многа сяброў калісьці. Але калі страціла зрок, некаторыя адвярнуліся. Ды што казаць, адвярнуліся практычна ўсе. Мая бяда вельмі добра праверыла людзей: са мной засталіся сапраўдныя сябры, у іх я цяпер упэўнена. Атрымала вельмі балючы жыццёвы вопыт, і пасля гэтага многае пераацаніла ў жыцці. Цяпер больш цаню тое добрае, што маю, таму што ведаю, як лёгка можна яго страціць...

* * *

Спачатку не асабліва і прыкметна, што яна не бачыць. Лёгкія, упэўненыя рухі, актыўная жэстыкуляцыя, эмацыйны твар... Людзі пачынаюць нешта разумець, толькі заўважыўшы ў руках дзяўчыны белы кій: «Дык вы не бачыце?» Яна не хоча насіць цёмныя акуляры. «Усе прывыклі да стэрэатыпу, што сляпы павінен быць у цёмных акулярах і з белым кіем у руках. Але я не стэрэатыпны чалавек», — смяецца Таццяна.

**«Калі кніга вельмі зацікавіла, потым купляю яе ў папяровым варыянце. Няхай і не змагу прачытаць, але мне падабаецца трымаць яе ў руках. Я люблю пах кніг».**

Хоць кіем даводзіцца карыстацца, без яго ніяк. Вядома, трэба пераступіць праз сарамлівасць, і гэта атрымалася не адразу. Але нават такі звыклы маршрут да працы (зусім кароткі, праца — праз дарогу, ёсць падземны пераход) нярэдка тоіць у сабе шмат нечаканасцяў.

— Напрыклад, аднойчы на тратуары раптам аказваецца машына. Або веласіпедысты... Яны не тармозяць чамусьці, гэта мне трэба паспець адскочыць, пачуўшы іх набліжэнне, — расказвае наша гераіня. — І кій на самай справе не дае стопрацэнтнай бяспекі. Вы ідзяце і махаеце ім перад сабой. А калі наперадзе адкрыты люк? Кіем лёгка прамахнуцца. Да таго ж кій унізе, а зверху, на ўзроўні твару, нішто не можа папярэдзіць аб небяспецы. У мяне сяброўка вельмі моцна неяк стукнулася аб інкасатарскую машыну: кіёк патрапіў паміж колаў і нічога не «заўважыў». Яшчэ пастаянна галінкі б'юць па твары. Але кій дапамагае павярнуць куды трэба, нейкія арыенціры ўсё ж дае... Увогуле, такія, як я, выходзяць кожны дзень на вуліцу на свой страх і рызыку. Даводзіцца быць вельмі сканцэнтраваным, пастаянна прыслухоўвацца да сваіх адчуванняў, каб правільна ісці і ні ў што не ўрэзацца. Задумвацца на вуліцы нельга! Замест вачэй у мяне вушы *(смяецца)*.

* * *

— Тым не менш, я хаджу на канцэрты, езджу ў іншыя краіны, — працягвае Таццяна. — Апошнім разам ездзіла ў Пецярбург да сяброў. Вы здзіўлены? А я сама купіла білет праз інтэрнэт. На вакзал мяне праводзіла сяброўка, пасадзіла ў цягнік. У Пецярбургу таксама сустрэлі на вакзале. А ў цягніку сяброўка не сказала правадніку, што ў мяне праблемы са зрокам, а ён і не заўважыў спачатку. Залезла на верхнюю полку, але было холадна, і я папрасіла суседку знізу падаць мне коўдру. У адказ — цішыня... Жанчына, як потым аказалася, не зразумела, што я не бачу. Потым доўга перапрашала: «Дзіцятка, ты б адразу сказала! А то я нічога не зразумела, думаю, каму ты кажаш, чаму сама не можаш узяць?»

Я карыстаюся айфонам і ноўтбукам са спецыяльнымі праграмамі, якія ўсё агучваюць. Усё, што вы бачыце на экране, на такіх прыладах прагаворваецца. Таму я магу заходзіць у інтэрнэт, спісвацца з сябрамі, рабіць пакупкі... Вы бачыце літары, а мне чытае тэкст спецыяльная праграма.

Я вельмі люблю чытаць, але з дапамогай методыкі Брайля не чытаю. Слухаю аўдыякніжкі ці электронныя, якія агучваюцца спецыяльнымі праграмамі. Калі кніга вельмі зацікавіла, потым купляю яе ў папяровым варыянце. Няхай і не змагу прачытаць, але мне падабаецца трымаць яе ў руках. Я люблю пах кніг.

...Аднойчы я сабралася і паехала ў Кіеў у госці да сяброўкі, нікога нават не папярэдзіўшы! Мы з ёю пазнаёміліся ў інтэрнэце і паўгода перапісваліся. І мне захацелася сустрэцца. Дамовіліся з ёй, я ўзяла квіткі і на выхадныя паехала. Вельмі добра правяла час, было цікава.

А ўчора я ездзіла да сяброўкі ў Чыжоўку. Я не баюся ехаць адна, але вельмі дрэнна, калі не абвяшчаюць прыпынкі ў аўтобусе ці тралейбусе ці абвяшчаюць іх няправільна. Але дапамагаюць людзі. Часам, калі выходжу з аўтобуса, адразу адводзяць да патрэбнага мне месца. Некаторыя цікавяцца, ці могуць дактары вярнуць мне зрок. Бывае, даюць свой нумар тэлефона: калі нешта трэба, тэлефануй, я тут непадалёк жыву, дапамагу схадзіць у магазін... Вось і ўчора мне ў метро дапамаглі супрацоўнікі станцыі — і там, дзе садзілася, і дзе выходзіла. А на прыпынку мяне сустрэў муж сяброўкі. А так, калі трэба зрабіць перасадку, стаіш на прыпынку і пытаеш людзей, які аўтобус зараз пад'ехаў.

* * *

— Чалавек да ўсяго можа прызвычаіцца, — лічыць Таццяна. — Цяжка было ў самым пачатку, пасля той аперацыі, якая кардынальна змяніла маё жыццё. І я ўсё яшчэ не губляю надзеі вярнуць зрок...

У астатнім жа наша гераіня такая ж, як усе дзяўчаты яе ўзросту: таварыская, любіць пасмяяцца, любіць гатаваць і прыдумляць новыя стравы. У вольны час піша вершы. У 2013 годзе нават удзельнічала ў Міжнародным фестывалі творчасці «Крылы надзеі», у рамках якога быў праведзены літаратурны анлайн-конкурс «Пачуць адзін аднаго». Яе апавяданне тады заняло першае месца!

**«У мяне ўсяго толькі няма зроку. Ну і што? Затое ў мяне ёсць рукі-ногі, я магу хадзіць, умею сябраваць».**

А зусім нядаўна яна стала іграць у тэатры «Мімоза». «Вельмі падабаецца. Буду развівацца ў гэтым кірунку», — кажа Таццяна. Ездзіць на рэпетыцыі даволі далёка, але яна спраўляецца — адыграла ўжо тры спектаклі. «У мяне невялікая роля, таму што я толькі-толькі туды прыйшла. Я іграю матылька ў дзіцячым спектаклі, танцую. Вельмі хвалявалася перад першым выхадам на сцэну, а калі выйшла — супакоілася. Аказалася, я камфортна сябе адчуваю і не баюся гледачоў. Творчасць — гэта маё! Я не хачуператвараць жыццё ў руціну. І наогул, імкнуся сама яго будаваць. Галоўны рэжысёр у сваім жыцці — я сама!»



**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

**СТУДЗЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**ЛЮТЫ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | | | | | |

**САКАВІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

**КРАСАВІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |

**МАЙ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

**ЧЭРВЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ЛІПЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

**ЖНІВЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

**ВЕРАСЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | |

**КАСТРЫЧНІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**ЛІСТАПАД**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

**СНЕЖАНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

# Праваслаўны каляндар

**16 красавіка — Светлае Уваскрэсенне Хрыстова. Вялікдзень.**

## Двунадзясятыя непераходзячыя святы

7 студзеня, субота .................... Раство Хрыстова
19 студзеня, чацвер.................. Хрышчэнне Гасподняе
15 лютага, серада..................... Стрэчанне Гасподняе
7 красавіка, пятніца ................. Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы
9 красавіка, нядзеля................. Уваход Госпада ў Іерусалім
25 мая, чацвер .......................... Узнясенне
4 чэрвеня, нядзеля .................. Пяцідзясятніца (Тройца)
19 жніўня, субота ..................... Праабражэнне Гасподняе
28 жніўня, панядзелак .............. Успенне Прасвятой Багародзіцы
21 верасня, чацвер.................... Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы
27 верасня, серада ................... Узвіжанне Крыжа Гасподняга
4 снежня, панядзелак............... Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы

## Вялікія святы

14 студзеня, субота.......................Абрэзанне Гасподняе і памяць свц. Васілія Вялікага
25 чэрвеня, нядзеля ................. Сабор Беларускіх святых
7 ліпеня, пятніца........................ Нараджэнне Іаана Прадцечы
12 ліпеня, серада..........................Святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла
11 верасня, панядзелак............. Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы
14 кастрычніка, субота............. Пакроў Прасвятой Багародзіцы

## Мнагадзённыя пасты

Вялікі пост .................................. з 27 лютага да 15 красавіка
Пятроў пост ................................ з 12 чэрвеня да 11 ліпеня
Успенскі пост............................. з 14 да 27 жніўня
Пост перад Нараджэннем Хрыстовым ...... з 28 лістапада 2017 года да 6 студзеня 2018-га

## Аднадзённыя пасты

Серада і пятніца на працягу ўсяго года, за выключэннем усядных тыдняў і Каляднага перыяду
Навячэр´е Богаяўлення ............................... 18 студзеня
Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы ............ 11 верасня
Узвіжанне Крыжа Гасподняга..................... 27 верасня

## Усядныя тыдні (па серадах і пятніцах посту няма)

Калядны перыяд ..................... з 7 да 17 студзеня
Мытара і фарысея .................. з 6 да 12 лютага
Сырны (масленічны)............... з 20 да 26 лютага
Велікодны (Светлы) ............... з 16 да 22 красавіка
Троіцкі ..................................... з 5 да 11 чэрвеня

## Трапеза ў святы

*Паводле Царкоўнага статута, у святы Нараджэння Хрыстовага і Богаяўлення, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, посту няма. У Навячэр´е Раства Хрыстовага, Навячэр´е Богаяўлення, у святы Узвіжання Крыжа Гасподняга і Усекнавення галавы Іаана Прадцечы дазваляецца ежа з алеем. У святы Стрэчання, Праабражэння Гасподняга, Успення, Нараджэння і Пакрова Прасвятой Багародзіцы, Увядзення Яе ў храм, Нараджэння Іаана Прадцечы, апосталаў Пятра і Паўла, Іаана Багаслова, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, а таксама ў перыяд ад Вялікадня да Тройцы ў сераду і пятніцу дазваляецца рыба.*

## Дні асаблівага памінання спачылых

Памінанне ўсіх спачылых, што пацярпелі ў час ганенняў за веру Хрыстову.....................................5 лютага
Субота мясапусная .................................18 лютага
Субота 2-га тыдня Вялікага посту..........11 сакавіка
Субота 3-га тыдня Вялікага посту..........18 сакавіка
Субота 4-га тыдня Вялікага посту..........25 сакавіка
Радаўніца...................................................25 красавіка
Памінанне спачылых воінаў....................9 мая
Субота Троіцкая .......................................3 чэрвеня
Субота Дзімітрыеўская...........................28 кастрычніка
Сабор навамучанікаў і вызнаўцаў зямлі Беларускай....................................29 кастрычніка

## Не праводзіцца вянчанне

*Напярэдадні серады і пятніцы ўсяго года (г. зн. па аўторках і чацвяргах)*
*Напярэдадні нядзельных дзён (г. зн. па суботах)*
*Напярэдадні двунадзясятых, храмавых і вялікіх свят*
*На працягу пастоў Вялікага, Пятровага, Успенскага і посту перад Раством*
*На працягу Каляднага перыяду (ад 7 да 19 студзеня)*
*На працягу сырнага тыдня (масленіцы), пачынаючы з Нядзелі мясапуснай і ў Нядзелю сырапусную*
*На працягу Велікоднага (Светлага) тыдня*
*У дні і напярэдадні Усекнавення галавы Іаана Прадцечы — 11 верасня і Узвіжання Крыжа Гасподняга — 27 верасня*

# Мусульманскі каляндар (1438—1439 гг. па Хіджры)

23-24 красавіка (26—27 раджаба) .... Узнясенне Прарока Мухамада (ноч Мірадж)
10-11 мая (14—15 шаабана).......... Ноч ачышчэння (Лейлят аль-Бараа)
27 мая (1 рамадана) ....................... пачатак мусульманскага посту (Ураза)
21-22 чэрвеня (26—27 рамадана)..... Ноч Прадвызначэння (Лейлят аль-Кадр)
25-27 чэрвеня (1—3 шаваля) ............ Свята разгавення — Ураза-Байрам. Заканчэнне мусульманскага посту
31 жніўня (9 зуль-хіджа) ..................... Дзень стаяння на гары Арафат
1-4 верасня (10—13 зуль-хіджа)........ Свята ахвярапрынашэння — Курбан-Байрам. Заканчэнне вялікага паломніцтва ў Мекку
21 верасня (1 мухарама)................ пачатак новага 1439 года па Хіджры
30 верасня (10 мухарама).............. Ашура, дзень памінання прарокаў і пасланнікаў Алаха
29-30 лістапада (12 рабі аль-аваля)....Дзень нараджэння Прарока Мухамада (Маўлід ан-Набі)

Даты календара могуць змяніцца ў залежнасці ад стану месяца.

# Каталіцкі каляндар

1 студзеня.................Святой Багародзіцы Марыі
6 студзеня.................Аб'яўленне Пана (Тры Каралі)
8 студзеня.................Хрост Пана
2 лютага....................Ахвяраванне Пана (Грамніцы)
1 сакавіка ..................Папялец (пачатак Вялікага посту)
19 сакавіка................Святога Юзафа
25 сакавіка................Звеставанне Пана
9 красавіка................Пальмовая нядзеля
16 красавіка..............Вялікдзень
23 красавіка..............Божай Міласэрнасці
25 мая ........................Унебаўшэсце Пана
31 мая ........................Адведзіны Найсвяцейшай Панны Марыі
4 чэрвеня ..................Спасланне Духа Святога
11 чэрвеня ................Найсвяцейшай Тройцы
15 чэрвеня ................Цела і Крыві Пана
23 чэрвеня ................Найсвяцейшага Сэрца Езуса
24 чэрвеня ................Нараджэнне св. Яна Хрысціцеля
24 чэрвеня ................Беззаганнага Сэрца Найсвяцейшай Панны Марыі
29 чэрвеня ................Святых апосталаў Пятра і Паўла
2 ліпеня ......................Найсвяцейшай Панны Марыі Будслаўскай
6 жніўня......................Перамяненне Пана
15 жніўня....................Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі
8 верасня ...................Нараджэнне Найсвяцейшай Панны Марыі
14 верасня .................Узвышэнне Святога Крыжа
2 лістапада ................Успамін усіх памерлых вернікаў
1 лістапада ................Усіх Святых
26 лістапада ..............Хрыста Валадара Сусвету
3 снежня ....................Першая нядзеля Адвэнту
8 снежня ....................Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі
25 снежня ..................Нараджэнне Пана
31 снежня ..................Святой Сям'і

# Лютэранскі каляндар

1 студзеня................. Новы год, Абразанне і нарачэнне імя Ісуса Хрыста
6 студзеня................. Богаяўленне, Эпіфанія
25 студзеня............... Дзень абарачэння святога апостала Паўла
2 лютага.................... Стрэчанне Гасподняе
1 сакавіка ................. Папяльцовая серада, пачатак Пакутнага часу
25 сакавіка ............... Дабравесце
9 красавіка ............... Вербная нядзеля
13 красавіка ............. Вялікі чацвер, Дзень усталявання Прычасця
14 красавіка ............. Пакутная пятніца
16 красавіка ............. Вялікдзень, Уваскрэсенне Гасподняе
25 красавіка ............. Дзень евангеліста Марка
25 мая ....................... Узнясенне Гасподняе
4 чэрвеня ................. Пяцідзясятніца, свята сашэсця Святога Духа
11 чэрвеня ................Тройца, свята Святога Трыадзінства
24 чэрвеня ................Свята Нараджэння Іаана Хрысціцеля
25 чэрвеня ................ Дзень Аўгсбургскага веравызнання
29 чэрвеня ................ Дзень святых апосталаў Пятра і Паўла
6 жніўня .................... Праабражэнне Гасподняе
21 верасня ................ Дзень апостала і евангеліста Мацвея
29 верасня ................ Дзень архангела Міхаіла і ўсіх анёлаў
2 кастрычніка ........... Свята падзякі за ўраджай
18 кастрычніка .......... Дзень евангеліста Лукі
30 кастрычніка .......... Дзень памінання ахвяр гвалту, вайны і тэрору
31 кастрычніка .......... Дзень 500-годдзя Рэфармацыі
11 лістапада ............. Дзень св. Марціна
22 лістапада ............. Дзень пакаяння і малітвы
26 лістапада ............. Дзень памінання спачылых. Нядзеля Вечнасці
24 снежня ................ Святы вечар. Пярэдадзень Нараджэння Хрыстовага
25 снежня ................ Нараджэнне Хрыстова
26 снежня ................ Дзень першапакутніка Стэфана
27 снежня ................ Дзень апостала і евангеліста Іаана
28 снежня ................ Дзень нявінна забітых немаўлят
31 снежня ................ Пярэдадзень Новага года

# Іўдзейскі каляндар

11 лютага.........................Ту бі-Шват
9 сакавіка ........................Пост Эстэр
12 сакавіка ......................Пурым
11 красавіка .....................Пейсах
14 мая ..............................Лаг ба-Омер
31 мая — 1 чэрвеня .........Шавуот
11 ліпеня ..........................Пост 17 тамуза
1 жніўня ...........................Пост Тышо-бэоў (9 ава)
21 верасня .......................Рош а-Шана
24 верасня .......................Пост Гедаллі
30 верасня .......................Ём-Кіпур
5 кастрычніка ..................Сукот
12 кастрычніка ................Шміні-ацэрэс
12 кастрычніка ................Сімхат-Тора
13 снежня ........................Ханука

Усе яўрэйскія святы пачынаюцца напярэдадні ўвечары.

■ Жыццёвінкі

# МНЕ ВЕЛЬМІ ХАЦЕЛАСЯ Б...

**1**

Не перастаю здзіўляцца нашым людзям. Вось паслухайце для пацвярджэння маіх слоў наступную гісторыю. Хаця гісторыю — гэта, магчыма, і гучна сказана. Проста сціплы будзённы жыццёвы факт. Такіх, упэўнены, хапае. І мой — не выключэнне.

Год колькі назад Кацярына Сцяпанаўна адпачывала з унучкай на Азоўскім моры, на ўзбярэжжы кватаравала ў мясцовых жыхароў, для якіх здача кватэр для аматараў марскіх уцех — някепскі бізнес. Некаторыя з іх і жывуць за кошт прыезджых. Кацярына Сцяпанаўна засталася задаволеная і адпачынкам, і людзьмі, у якіх знайшла часовы прытулак. Добрыя, простыя і сціплыя. Развітваючыся, абмяняліся адрасамі. Ці мала што? Свет, як кажуць, цесны. Ды і можна будзе параіць каму-небудзь з суседзяў ці знаёмых, разважала Кацярына Сцяпанаўна, запісваючы адрасок, — калі пажадаюць, то прыедуць не абы-куды, а ўжо па канкрэтным адрасе.

— Ды і вы да нас прыязджайце, людзі добрыя! — запрасіла, не загадваючы далёка, Кацярына Сцяпанаўна. — Прымем як родных. У нас у Беларусі добра.

Так сталася, што ў той гаспадыні захварэў сын, і цяжка. Лячыць у Кіеве дорага, ды і ці возьмуцца дактары, бо яны ж — з Марыупаля, з ДНР. Найшла, як кажуць, каса на камень. І тут яны ўспомнілі пра гамяльчан, якія колькі год назад адпачывалі на моры. Патэлефанавалі. Кацярына Сцяпанаўна выслухала, нічога канкрэтнага, вядома ж, не паабяцала, толькі хіба што адно — пацікавіцца, ці возьмуцца лячыць нашы беларускія дактары. «Хай прыязджаюць!» — запэўнілі ў лячэбніцы.

Больш за месяц госці, маці з сынам, жылі ў Кацярыны Сцяпанаўны. Зяць яе не вылазіў з легкавіка — то ў бальніцу, то з бальніцы, то ў аптэку, то яшчэ куды...

Падлячыліся марыупальцы і паехалі. Кацярына Сцяпанаўна, правёўшы гасцей, пахвалілася суседцы, што тыя засталіся задаволенымі.

— Ну, і колькі ж яны табе заплацілі за месяц пражывання? — нібы між іншым пацікавілася суседка.

Кацярына Сцяпанаўна падняла на яе здзіўленыя вочы:

— Заплацілі? За што?

— Як за што? За дах над галавой. За ложкі. Ды і карміла ж іншы раз, ведаю, не шкадавала кавалка хлеба. Ты ж у іх бясплатна не жыла, а за суткі сама памятаеш, колькі плаціла.

— Што ты такое кажаш, суседка? — Кацярына Сцяпанаўна, падалося, нават пакрыўдзілася. — Дык я ж на курорце была, там усе плацяць... Не, не, ні капейкі не ўзяла. Жылі сабе і жылі... А дзе ім было жыць?..

**2**

Кінулася ў вочы мне адна бабулька. Хударлявая, невысокага расточку, акуратна апранутая. А звярнула яна на сябе ўвагу тым, што, выходзячы на прыпынку перад палiклiнiкай, прапаноўвала свой талончык на праезд амаль кожнаму, хто заходзіў у салон тралейбуса і сустракаўся з ёй у дзвярах. Нехта адмахваўся ад такой добранькай назолы — не інакш не хацеў прыніжацца, а хтосьці і браў у яе той квіток.

Такое я назіраў некалькі дзён запар. Для сябе вырашыў: відаць, у паліклініку бабулька ездзіць на працэдуры. Бач, якая добрая душа — думае пра іншых, дзеліцца нават квітком.

І ў той дзень яна торкнула талон у рукі такой жа старой, як сама: бяры, не шкада, ды і сэканоміш на паўбуханкі малака. Ну, тая ўзяла ды і едзе сабе спакойна. Але на чарговым прыпынку ў салон зайшлі кантралёры. Скончылася тым, што бабульку вывелі: талончык аказаўся «ліпавым», і яна адчувала сябе надта ж няёмка, вы б толькі пабачылі. Засаромелася, не ведала, куды вочы падзець.

Пашкадаваў бабульку і я. Тралейбус пайшоў далей, і тут мой сусед, дзядок у бейсболцы і акулярах, які да гэтага маўчаў, раптам разгаварыўся:

— Ды ведаю я тую бабу, якая квіткі гэтыя падбірае дзе толькі можна, а потым раздае іх людзям пры выхадзе: гляньце, маўляў, якая я добранькая! Тыя і не здагадваюцца, што яна іх падстаўляе. Каму і пашанцуе: праедуць бясплатна, не пярэчу. Але бывае, што і не... І навошта яна, старая, так робіць? Можа, насаліўшы чалавеку, потым адчувае сябе задаволенай? Ці, магчыма, аштрафавалі самую, то наце і вам, людцы добрыя. Атрымайце тое, што і я атрымала. Не, скажаш?

Не скажу. Вось проста так — не скажу. Трэба будзе папытаць у самой бабулькі, калі яшчэ сустрэнуся з ёй. Хаця наўрад ці прызнаецца.



**3**

Як цяпер помню школьную майстэрню. Знаходзілася яна ў цокальным памяшканні школы, дзверы ў дзверы са спартзалай. Там нас ветла сустракаў настаўнік працы Аляксандр Дзмітрыевіч Шурмялёў, высокі і хударлявы, заўсёды спакойны і разважлівы, бацька адной з нашых аднакласніц. Мы ледзь не бегма спяшаліся да яго. У нас сёння сталярная справа! Дзяўчынкі недзе ў класе шылі, а мы, хлапчукі, стругалі, грукалі малаткамі, пілавалі... Як хараша тут, у гэтай сціплай майстэрні, пахла жывым лесам!

Ці не ў апошнім, адзінаццатым класе, мы ўсе рабілі табурэты. І не проста рабілі, а здавалі экзамен, і кожны «шэдэўр» ацэньвала камісія, бо не жартачкі ж! У мяне вунь і сёння захоўваецца пасведчанне сталяра трэцяга разраду. Не помню ўжо, даруйце, бо прайшло роўна шэсцьдзесят год, што мне паставілі за той табурэт і куды ён падзеўся, а вось за аднакласніка парадаваўся. Неяк на сустрэчы ў школе настаўнік Анатоль Пятровіч Атрохаў пахваліўся: «А мне яшчэ і сёння служыць табурэтка Валерыя Горына!»

Валерый Горын жыве ў Тальцы, далёка ад пасёлка Ільіч, дзе мы вучыліся ў школе, і я перадаў яму словы настаўніка. Балазе, сёння гэта проста можна зрабіць. Уявіў, як твар былога аднакласніка кране лёгкая, пяшчотная ўсмешка... А каму б не было прыемна?!

**4**

Яшчэ адзін аднакласнік мне ўспомніўся — Міша Чутнікаў. Былі мы тады вучнямі малодшых класаў, і неяк узімку павезлі нас у Магілёў на экскурсію. Добра помню, паглядзелі ў абласным драматычным тэатры спектакль «Чароўны востраў», а потым настаўніца адвяла нас у сталоўку, дзе мы, разявіўшы раты, з невыказным пачуццём радасці глядзелі-дзівіліся на акцёраў, якіх толькі што бачылі на сцэне і якія таксама прыйшлі ў гэтую сталоўку. Ці трэба казаць, што адчувалі: вось яны, аказваецца, якія, гэтыя артысты!.. Гэта вам не жартачкі — мы з імі ледзьве не за адным сталом сёрбалі боршч і елі катлеты. Тым больш прыемна было, што яны нос асабліва не задзіралі.

Ну, а потым, падсілкаваўшыся, мы адзін за адным пайшлі па тратуары. Пад ногі не было калі глядзець — вочы стараліся ўхапіць будынкі, міма якіх праходзілі, прачытаць назву кінатэатра, («Чырвоная зорка»), звярнуць увагу на шыльдачку, што іншы раз траплялася на сцяне і сведчыла, што ў гэтым доме жыў некалі славуты чалавек.

Не маглі не заўважыць, як міма нас праходзіў строй салдат. Яны пратупалі сабе ды і зніклі з вачэй, у іх свой клопат, а наша настаўніца правяла своеасаблівую пераклічку: ці ўсе на месцы, мо хто і згубіўся? Не жартачкі — упершыню ў горадзе, а горад не вёска: тут лёгка адбіцца ад класа, спакусы хапае. Так і ёсць — аднаго вучня няма. Высветлілася: прапаў Міша Чутнікаў. Быццам усе яго толькі што бачылі, а хлапчук знік. Настаўніца разгубілася, мы, дзеці, таксама пачалі хвалявацца: куды ж ён, насамрэч, падзеўся? Аднак нядоўга бедавалі. Знайшоўся Міша. На нашы кпіны прызнаўся: «На салдат загледзеўся і сам не ўбачыў, як за імі патупаў і патупаў ...»

Можа, тады і ўзялі ў палон хлопцы ў шынялях і з бадзёрымі і чырвонымі ад марозу тварамі майго аднакласніка, бо ён стаў... вайскоўцам. Закончыў службу, жыве ў Калузе. Год колькі назад з ім пабачыліся, і я нагадаў яму пра тое здарэнне ў Магілёве... Ды яно так, відаць, і было: якраз тады ён упершыню і «прымераў» сябе да салдат, «падабраў нагу», каб далей ісці з імі ўпоравень. Раз-два! Раз-два!.. І так амаль трыццаць год чаканіў крок наш Міша, прабачце, — Міхаіл Іванавіч.

**5**

Дзве Валянціны жывуць у адным доме, толькі паверхі розныя: адна на першым, а другая — на апошнім, дзявятым. Вось ужо некалькі месяцаў, як яны выходзяць, так бы мовіць, на вечаровы шпацыр перад сном. Паблізу ад іх дома ёсць возера, камунальнікі паклапаціліся, каб такія пенсіянеры, як нашы дзве Валянціны, маглі іншы раз без перашкод падыхаць свежым паветрам: акружылі возера акуратнымі заасфальтаванымі дарожкамі, толькі хадзіце. А яшчэ, прызнаюцца яны, хочацца на людзей паглядзець. З гэтым ахвотна пагаджаешся, бо як толькі вернуцца ў свае кватэры — столькі ўражанняў пачуюць дамашнія! На любы густ.

Але, падазраю, ёсць і іншая прычына, дзякуючы якой вось ужо колькі месяцаў запар ходзяць нашы Валянціны на вячэрнія прагулкі. Не здагадваецеся? Падкажу: яны ж назапасілі столькі адзення, ажно дзверы ў шафах не зачыняюцца. Што, так і прападаць дабру? Вось і выходзяць на той шпацыр кожны раз у новым: няхай хоць такія ж мінакі, як яны самі, падзівяцца, што за прыгажуні яшчэ ёсць у нашым мікрараёне!..

**6**

Еду ў тралейбусе і заўважаю, як за акном — якраз насупраць мяне — ідзе даволі рослая, танклявая, бы маладая таполя, дзяўчына. Але што гэта? Яна ў боціках, але на адным боціку... няма каблука, аднак дзяўчына стараецца ісці роўна, амаль плыве, і не адразу ўбачыш, што адбылося з ёй такое вось непрыемнае здарэнне: зламаўся каблук, яго наогул няма. Ідзе і выгляду не паказвае, нават крыху нос задрала: у мяне ўсё добра, не звяртайце ўвагі, даклипаю.

Не адзін я звярнуў увагу на дзяўчыну. Той-сёй пракаментаваў сітуацыю, але ніхто не ўсміхаўся, а, наадварот, кожны паспачуваў прыгажуні.

Паколькі тралейбус спыніўся перад святлафорам, то паспеў заўважыць, як перад дзяўчынай раптам спыніўся легкавік, за рулём якога сядзела таксама дзяўчына, і неўзабаве, нешта сказаўшы, дзяўчына з паламаным каблуком села і паехала. Можна было здагадацца, што дагэтуль яны ніколі нават не сустракаліся.

Не ведаю, як хто, а я ўявіў, як дзяўчына зняла з нагі той «невязучы» боцік, і толькі цяпер паглядзела, што там і як. Тут, у салоне аўтамабіля, лішніх вачэй няма.

І чамусьці яшчэ ўявіў, як дзве незнаёмыя раней дзяўчыны ўсміхнуліся адна адной. А тая, напэўна, сказала: «Куды ехаць? Паказвайце. Я даўязу...»

Можа, і памыляюся. Але мне вельмі хацелася б, каб было так.

**Васіль ТКАЧОЎ**

■ Будзь у курсе!

## Калі і чым частаваць птушынае царства?

**Падкормліваць птушак з мэтай выратавання варта толькі ў экстрэмальныя перыяды зімоўкі, напрыклад, пры рэзкім зніжэнні тэмпературы (мінус 15 градусаў і ніжэй), а таксама пры наяўнасці ў іх фізічных пашкоджанняў, калі вадаплаўныя сапраўды могуць апынуцца на мяжы гібелі. Пра гэта нагадваюць спецыялісты Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

У такіх выпадках прадстаўнікам птушынага царства лепш за ўсё даваць аўсянку з сырой і варанай гароднінай, прарослыя злакі — авёс, ячмень, пшаніцу. Аднак нельга забываць, што нават гэты корм ненатуральны для вадаплаўных птушак і, па некаторых дадзеных, адмоўна адбіваецца на стравальнай сістэме і ўплывае на абмене рэчываў. Гэта не кажучы пра белы і чорны хлеб, які выкарыстоўваецца для падкормкі найчасцей! Трэба памятаць і тое, што, падкормліваючы вадаплаўных птушак, мы адвучаем іх ад самастойнага пошуку харчу, і яны становяцца залежнымі ад чалавека. Яны самі могуць пра сябе паклапаціцца, і дапамога ім патрэбна толькі ў сапраўды экстрэмальных сітуацыях.



У той жа час, у зімовы перыяд наша дапамога патрэбна іншым, менш прыстасаваным да зімоўкі відам, такім, як вераб'і, сініцы, папаўзні. Дробныя пеўчыя птушкі з надыходам халадоў ляцяць у населеныя пункты. Тут мякчэйшы мікраклімат, перыядычна можна знайсці адкрытыя ўчасткі глебы, і таму лягчэй пракарміцца.

Зімой у гарадзе значна часцей можна сустрэць снегіроў, зелянушак, чыжоў, соек. Больш звычайнымі становяцца вялікія сініцы, лазаракі, папаўзні. Яны з задавальненнем наведваюць кармушкі, але, у адрозненне ад вадаплаўных птушак, не трапляюць у поўную залежнасць ад прыкорму. Ежа, якой іх падкормліваюць, па сваіх гастранамічных уласцівасцях мала адрозніваецца ад натуральнага зімовага харчу, таму з надыходам спрыяльнага перыяду яны вяртаюцца ў лясы, паркі, скверы і лёгка пераключаюцца на натуральны корм з насякомых, насення, вегетатыўных частак раслін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
rs@zviazda.by

■ Ваша бяспека

# Калі страцілі раўнавагу...

**Аналіз сітуацый зімой, што суправаджаюцца траўмамі, паказвае, што толькі 15 працэнтаў іх узнікаюць з прычыны недапрацоўкі камунальнікаў, дрэннага стану дарог і недастатковага асвятлення. У большасці выпадкаў вінаватыя наша неасцярожнасць, ігнараванне элементарных правілаў бяспекі. Некалькі важных парад дае урач-валеолаг Леанід МЯЛЕШКА.**

Па-першае, не трэба баяцца і чакаць падзення, стаўце ногі цвёрда. Па-другое, не насіце ў такое надвор'е, як цяпер, абутак на высокім абцасе — неабходны той, што з пратэктарамі, які не становіцца цвёрдым пры нізкай тэмпературы.

Калі даводзіцца ісці па наледзі, імкніцеся трымаць рукі свабоднымі, не трымайце іх у кішэнях, каб можна было балансаваць. Ступаць варта поўнай ступнёй, невысока ўзнімаючы ногі, а яшчэ лепш наогул не адрываць ад зямлі і крышку сагнуць пры гэтым калені. Самі пры гэтым будзьце расслабленымі і не спяшайцеся. Не сакрэт, што часцей падзенні здараюцца раніцай і ўвечары, калі мы ідзём на працу ці дадому.



## Падаем правільна...

✓ Не выстаўляйце рукі ў бок падзення.

✓ Усё, што было ў руках, адпусціце.

✓ Не падайце на спіну — можаце сур'ёзна пашкодзіць пазваночнік або галаву.

✓ Згрупуйцеся, напружце мышцы, прыцісніце рукі да цела, галаву ўцягніце ў плечы і падайце на бок. Адзенне запэцкаецце, але рукі-ногі ўратуеце.

## ...і правільна ўстаём

✓ Ніколі не ўставайце рэзка, паляжыце, заварушыце рукамі-нагамі-галавой. Калі рэзкага болю няма, значыць, нічога не зламана і можна паднімацца.

✓ Калі ўсё не так добра, не панікуйце і паклічце каго-небудзь на дапамогу.

✓ Атрымаўшы ўдар, можна рухацца, а вось пры расцяжэнні звязак без дапамогі не абысціся. А пры пераломе неабходна выклікаць хуткую дапамогу.

✓ Пакажыцеся ўсё ж такі пасля траўмы ўрачу: некаторыя пашкоджанні могуць заявіць пра сябе не адразу.

✓ Надалей і заўсёды займайцеся фізкультурай, умацоўвайце мышачна-касцявую сістэму. Так і на дарозе будзеце сябе пачуваць больш упэўнена ■

■ Цяжкасці грыпу

# САМЫ ПАСЦЕЛЬНЫ РЭЖЫМ, А НЕ ТОЕ...



**Аслаблены вірусамі арганізм можа не справіцца з другой хваляй — бактэрыяльнай інфекцыяй. Ускладненне грыпу можа перайсці ў хранічныя хваробы, якіх нямала. Атыт, сінусіт, гаймарыт, пнеўманія, бранхіт, неўралгія, неўрыт, менінгіт, інфаркт, міякардыт, вострая сардэчная недастатковасць, інсульт, цыстыт, піеланефрыт, міязіт, абвастрэнне цукровага дыябету, парушэнне абмену рэчываў, рэўматызм, бранхіяльная астма...**

— Грып моцна зніжае імунітэт, а калі абарончыя сілы арганізма аслабелі, то бактэрыі паднімаюць узмоцнена размнажацца, — тлумачыць **загадчыца 2-га тэрапеўтычнага аддзялення 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Вольга ЯЧЭЙКА.** — А ў многіх выпадках захворванне яшчэ і пераносіцца на нагах, не вытрымліваецца пасцельны рэжым. Пацыент выбірае самалячэнне і, адчуўшы палёгку пасля ўжывання моцных прэпаратаў, мяркуе, што перамог вірус. Але гэта не так. Лячыцца неабходна мінімум 7, а лепей 10 дзён. У адваротным выпадку пачнецца другая атака, якая заявіць аб сабе слабасцю, кашлем, галаўным болем. Пры любых ускладненнях звяртацца да ўрача трэба абавязкова!

Самае частае ўскладненне грыпу — **пнеўманія**, якая надыходзіць якраз пасля нейкай палёгкі і праяўляецца павышэннем тэмпературы да 39 градусаў, дрыжыкамі, болем у грудзях, моцным кашлем, скураным сыпам, макротай з крывёй. Лячэнне, як правіла, праводзіцца ў стацыянары.

Пашкоджваць могуць і ныркі з мочавыдзяляльнымі шляхамі — можа развіцца **піеланефрыт, гламерулАнефрыт, вострая ныркавая недастатковасць, цыстыт.** Можна пры гэтым нават нічога не адчуваць, а можа быць і боль у паясніцы, высокая тэмпература, змяншэнне колькасці мачы. Выявіць паталогію дапаможа аналіз мачы, здаць які ўрачы-нефролагі рэкамендуюць праз 10 дзён пасля любой прастуды, а тым больш пасля грыпу.

Можа развіцца і востры **гаймарыт** — запаленне ў пазухах носа. Будуць балець зубы, галаўны боль аддае ў корань носа. Захворванне можа перайсці ў хранічную форму, што вельмі дрэнна паддаецца лячэнню.

Асабліва небяспечна пашкоджанне нервовай сістэмы пры грыпе. Яно можа праяўляцца ў выглядзе **неўралгіі, радыкуліту, палінеўрыту.** Але цяжэй за ўсё бывае пры **арахнаідыце і менінгіце.** Першае пачынаецца прыкладна на сёмы дзень, калі грыпозная ліхаманка адступіла, але з'явіліся мошкі перад вачамі, млосць, галавакружэнне, засталіся слабасць і санлівасць. Здаецца, гэта наступствы інтаксікацыі пасля грыпу, але на самай справе — парушэнне цыркуляцыі спінамазгавой вадкасці, з-за чаго пачалося запаленне мозгу, што пагражае сепсісам. На 5—7-ы дзень, калі тэмпературы няма, можа з'явіцца раптоўны галаўны боль, пасля млосць, не звязаная з ежай, боязь святла — гэта менінгіт.

Ёсць пагроза і для сардэчна-сасудзістай сістэмы. Таксічнае пашкоджанне сардэчнай мышцы суправаджаецца арытміяй-тахікардыяй або пачашчаным пульсам, болем у сэрцы. Наогул падчас эпідэміі павышаецца смяротнасць сярод хворых на гіпертанію, ішэмію ў пажылых, а ў маладых, нават са здаровым сэрцам, можа ўзнікнуць, напрыклад, міякардыт — запаленне сардэчнай мышцы.

Пацярпець можа вегетатыўная нервовая сістэма, што адаб'ецца на ўнутраных органах, справакуе абвастрэнне хранічных захворванняў — сардэчна-сасудзістых, цукровага дыябету, бранхіяльнай астмы ■

## У зоне рызыкі

**Пажылыя.** Пасля 60 гадоў часцей развіваецца пнеўманія, бранхіт, танзіліт. Далей з кожным дзесяцігоддзем рызыка захворвання на грып з ускладненнямі істотна ўзрастае.

**Цяжарныя.** Ёсць пагроза заўчасных родаў, затрымкі развіцця плода. Найбольш небяспечны грып у першым трыместры, да 12 тыдняў, калі закладваецца большасць органаў і тканак дзіцяці.

**Дзеці.** Самымі цяжкімі ўскладненнямі будуць энцэфаліт, атыт, пнеўманія і сіндром Рэя. Да атыту схільныя дзеці да 2 гадоў, якія не могуць самастойна ачысціць нос ад слізі, а таму інфекцыя трапляе праз нос да вушэй.

## Календула супраць мікробаў

Ніводная прышчэпка не забяспечыць стопрацэнтную гарантыю адсутнасці заражэння вірусам. Таму іншыя меры абароны ніхто не адмяняў. Вашы сябры ў любым узросце — здаровы лад жыцця, загартоўка, ужыванне полівітамінаў пасля ўзгаднення з урачом, правільнае харчаванне, умераная фізічная актыўнасць. У час эпідэміі — пазбяганне людных мясцін, дасканалае мыццё рук. Карыстайцеся самі і прывучыце ўсю сям'ю да мазяў кштalту аксалінавай. На ноч можна паласкаць рот настойкай з эўкаліптам або календулай — яны дапамогуць змыць шкодныя мікробы, якія назапасіліся на слізістай за дзень. Калі нехта з блізкіх захварэў, у яго пакоі варта рэгулярна праветрываць, а ўсім здаровым пажадана карыстацца ватна-марлевымі павязкамі.

■ Псіхалогія для ўсіх

# НЯПРОСТАЯ ЗАДАЧА ДЛЯ СВАЯКОЎ

**Эмоцыі чалавека з псіхічным захворваннем адрозніваюцца ад таго, што перажывае здаровы. Гэта першае, што трэба разумець.**

У тых установах, дзе знаходзіцца на ўліку хворы, абавязкова ёсць і кансультацыі ці нават спецыяльныя адукацыйныя праграмы для сваякоў. Так можна падрабязней даведацца аб тым, што адбываецца пры дадзеным захворванні, як вы можаце дапамагчы.

— Калі хочаце хоць неяк зразумець, наколькі зніжаны эмоцыі ў псіхічнахворага, прыгадайце сябе ў самыя цяжкія хвіліны тугі і смутку, калі ёсць толькі адно жаданне — схавацца ад рэальнага жыцця, забіцца ў кут, — расказвае **псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Наталля СТАТКЕВІЧ.** — Бо размова ідзе пра нейкі свой свет, заглыбленне ў сябе, згасанне прывязанасці і любові нават да самых дарагіх людзей. Гэта не ангіна і не галаўны боль. Псіхічнае захворванне — працяглы шлях, які неабходна прайсці разам, прымяняючы медыкаментознае і псіхатэрапеўтычнае лячэнне. Але гэтае лячэнне не прынясе карысці і рэмісіі без падтрымкі блізкіх, без правільных стасункаў з хворым.

Галоўнае — гэта павага і стаўленне як да здаровага. Будзьце спакойнымі, паслядоўнымі і адкрытымі. Стрымлівайце эмоцыі, не даказвайце што-небудзь у крытычны момант. Не абражайце, не гаварыце крыўднае, каб не абудзіць страх, боязь зрабіць што-небудзь не так і забіць давер. Захоўвайце пазітыўны настрой нават пры нягодах. Заўважайце нават самыя малыя станоўчыя зрухі. Рабіце акцэнт толькі на станоўчым: хворы і без таго пакутуе. Рабіце канкрэтныя заўвагі ў канкрэтны момант. Не патрабуйце больш, чым можа хворы. Стаўце толькі блізкія мэты. Плануйце разам дзень, уцягвайце ў справы. Хвораму часам нашмат прасцей падтрымліваць стасункі віртуальна, пісаць, а не гаварыць. Таму не трэба адрываць яго ад камп'ютара ■

■ Асаблівасці захворвання

# ПАЗВАНОЧНІК ГЭТАГА НЕ ЛЮБІЦЬ



**Змяненні, дэградацыя ў тканках міжпазваночных дыскаў, суставаў, звязак, касцявой тканкі могуць праяўляцца цяжкімі парушэннямі, здольнымі прывесці нават да страты працаздольнасці. Звязаныя з гэтым хранічныя захворванні адносяцца да групы так званых дэгенератыўна-дыстрафічных.**

**Адным з такіх захворванняў з'яўляецца дыскагенны радыкуліт, ад якога пакутуе пасля 30 гадоў кожны пяты. Што такое боль у спіне, ведае кожны чалавек, праўда, па медыцынскую дапамогу звяртаецца дзесьці каля 40 працэнтаў.**

— Татальная камп'ютарызацыя, пераход ад фізічнай працы да разумовай прывёў да змяншэння рухальнай актыўнасці, зніжэння тонусу мышцаў, — тлумачыць **урач-рэнтгенолаг 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Наталля ЦІХЕНЯ.** — 80 працэнтаў часу пазваночнік знаходзіцца ў вымушаным паўсагнутым стане, а гэта расцягвае мышцы, якія згінаюць спіну, і зніжае іх тонус. Адсюль і праблема дыстрафії пазваночнага слупа — хандрозы дыска, астэахандроз, спандылёз...

Касцявая тканка, як і любая іншая, можа абнаўляцца: чым большая нагрузка на пазванкі, тым актыўней утвараюцца новыя клеткі. Пры мышачнай гіпатаніі або пастаянным напружанні мышцаў парушаецца кровазварот у тканках, у мышцах і звязках узнікае запаленне. Паступова з'яўляюцца касцявыя нарасты, грыжы, змяшчэнні пазванкоў.

У шыйным аддзеле астэахандроз заявіць аб сабе ранішнім галавакружэннем, болем, шумам у вушах, млосцю і нават праблемамі са зрокам. Паралельна з галаўным можа ўзнікаць сардэчны боль. У выніку боль нарастае, а рухавасць шыі зніжаецца. Рукі могуць нямець і мерзнуць.

Дыстрафічныя змяненні выяўляюцца падчас рэнтгену шыйнага аддзела. Пры неабходнасці прызначаюць тамаграфічнае даследаванне.

## Што рабіць у маладым узросце?

1. Пазбягаць пераахаладжвання і вільгаці — гэта першыя ворагі пазваночніка, які заўсёды павінен быць у цяпліні і сухасці.

2. Варта пазбягаць рэзкіх, празмерных фізічных нагрузак.

3. Офіснаму работніку неабходна адкідвацца на спінку крэсла кожныя паўгадзіны.

4. Становішча цела карысна часцей змяняць.

5. Праз кожныя гадзіну-паўтары трэба ўстаць з-за стала і пахадзіць хвілін 5-10.

6. Неабходна займацца фізкультурай, якая будзе ўмацоўваць мышцы спіны і прэса ■

Матэрыялы падрыхтавала
Святлана БАРЫСЕНКА. protas@zviazda.by

# ООО «Юридическая компания Аспект» проводит повторные ТОРГИ в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «МОДЕРАТО», находящегося в процедуре ликвидации

| № лота | Наименование лота | Начальная цена за лот, руб.* | Шаг торгов, руб. | Задаток для участия в торгах, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Буровая установка 1БА15К на шасси МАЗ 5337 1989 г.в. с к-том буров. инстр-та. (224,2 м) и ротором-приставкой Р410 | 45 000,00 | 2 250,00 | 4 500,00 |
| 2 | Буровая установка УГБ-ЗУК | 6 047,62 | 302,38 | 604,76 |
| 3 | Сварочный аппарат АДД-4001У1 | 804,6 | 40,23 | 80,46 |
| 4 | Емкость металлическая 10 куб. м | 313,95 | 15,70 | 31,40 |
| 5 | Бортовой прицеп на шасси Маз 8925 1989 г.в. | 722,93 | 36,15 | 72,29 |
| 6 | Автомобиль KAMAZ 5320 1990 г.в. (с гидроманипулятором «АТЛАС» 80.1, стрела 7 м, г/п 4тн) | 11 020,78 | 551,04 | 1 102,08 |
| 7 | Компрессор ПВ-10 на шасси МАЗ 8925 1989 г.в. | 6 015,24 | 300,76 | 601,52 |

| | |
|---|---|
| **Продавец:** | **ООО «МОДЕРАТО»** |
| **Организатор торгов:** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Место проведения торгов:** | **г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 6, оф. 20 (минус 1 этаж)** |
| **Дата и время проведения торгов:** | **16.01.2017 в 11.00** |
| **Срок подачи заявок:** | **по 12.01.2017 до 18.00** |
| **Порядок подачи заявок:** | организатору торгов по месту проведения торгов либо по адресу: 220050, г. Минск, а/я 85 |
| **Срок внесения задатка:** | **по 12.01.2017** |
| **Реквизиты для оплаты задатка:** | **Бенефициар – Брестский филиал ООО «МОДЕРАТО»** р/с в бел. руб. № 3012441147019 в Дирекции ОАО «БЕЛИНВЕСТБАНК» по Брестской области, г. Брест, код 739, УНП 201002999 |

**Условия торгов:**

• к участию в торгах (аукционе) допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке;

• лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением оригинал платежного документа, подтверждающего внесение на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении, суммы задатка (задатков), с отметкой банка. При личном обращении заявитель (представитель) предъявляет оригинал документа, удостоверяющего личность. Дополнительно организатору торгов представляются:

- юрлицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе с их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность на представителя или документ, подтверждающий полномочия руководителя юрлица; юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом РБ): копии учредительных документов вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выданной не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, доверенность на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенныимм переводом на русский язык;

- индивидуальным предпринимателем: копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

- представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя: нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь): легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

• победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;

• договор купли-продажи подлежит заключению в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов;

• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретение предмета торгов;

• в случае отказа (уклонения) победителя торгов, единственного участника торгов от подписания протокола о результатах торгов, возмещения затрат на организацию и проведение торгов, подписания договора, а также в иных случаях, предусмотренных актами законодательства, внесенный этим участником задаток возврату не подлежит.

• в случае если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов;

• победитель/единственный участник торгов, выразивший согласие на покупку предмета аукциона, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов, оплачивает цену лота **без учета НДС 20% (продавец не является плательщиком НДС)**, за вычетом суммы внесенного задатка, в течение 5 (пяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи.

**– в денежных знаках Республики Беларусь образца 2009 г.*

Предыдущее извещение о торгах опубликовано в печатном издании «Сельская газета» 29.10.2016 г.
Получить дополнительную информацию о порядке проведения аукциона можно по телефонам:
**+375 (44) 5986627, 8(017) 2130699.**

**ОБЪЯВЛЕНИЕ**

## ОАО «Минскоблхлебопродукт»

**извещает, что 13 января 2017 года**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 4.**
**Начало собрания в 14.00.**
**Регистрация акционеров с 13 часов 30 минут.**
**При себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

• О реорганизации открытого акционерного общества «Минскоблхлебопродукт» путем присоединения к нему открытого акционерного общества «Борки Агро».

• О внесении изменений и дополнений в Положение о порядке купли-продажи жилых домов (квартир), находящихся в собственности ОАО «Минскоблхлебопродукт».

**Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт»**
**Тел. 220-59-17.**

УНП 600013173

■ Падаткі

# РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

## Дэкрэт аб сацыяльным утрыманстве плануецца падкарэктаваць яшчэ сёлета

**Аб гэтым учора паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) Міхаіл РАСОЛЬКА.**

Ён адзначыў, што сёння інспекцыямі накіравана больш за 240 тысяч паведамленняў на выплату збору тым, хто не ўдзельнічаў у фінансаванні дзяржаўных расходаў. «Збор заплацілі ўжо 12 тысяч чалавек, а ў бюджэт па гэтаму плацяжу паступіла больш за 3,7 млн рублёў. Пры гэтым трэба разумець, што ў грамадзян ёсць месячны тэрмін, каб разлічыцца з дзяржавай. Шмат у каго яшчэ не наступілі тэрміны аплаты, паколькі мы накіроўвалі паведамленні і ў канцы лістапада — пачатку снежня», — растлумачыў Міхаіл Расолька.

Начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб таксама адзначыў, што ў дэкрэт №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» плануецца ўнесці змены. «На нядаўняй нарадзе ў кіраўніка дзяржавы ішла гаворка пра тое, што будзе пашырацца шэраг катэгорый грамадзян, на якіх будуць распаўсюджвацца льготы па аплаце збору. Павінны таксама быць прадугледжаны больш шырокія правы мясцовых выканаўчых органаў па прадастаўленні льгот у гэтай частцы», — адзначыў спецыяліст.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение, инв. № 412/С-24197 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – заготовительный ларек), площадью 49,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Кирова, 37А |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 424050100006000382 (назначение – для обслуживания здания заготовительного ларька), площадью 0,0221 га, расположенный по адресу: г. Мосты, ул. Кирова, 37А |
| **Начальная цена продажи** | 12480,00 р. (двенадцать тысяч четыреста восемьдесят рублей) с учетом НДС. |
| **Сумма задатка** | 1248,00 р. (одна тысяча двести сорок восемь рублей) |
| **Продавец** | Мостовский филиал Гроднооблпотребобщества, 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 24 января 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.05.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 18 января 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

В связи с поступлением заявлений акционеров о продаже акций ЗАО «СМУ-77», просим желающих акционеров общества подавать заявления о приобретении акций. УНП 100064641

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС № 5008802 **считать недействительным.** УНП 100122726

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | Право заключения договора аренды сроком 3 года:<br>- капитального строения, инв. № 450/С-1102 – ангарный склад (площадью 477,0 кв.м), заборов (площадью 418 кв.м) и ворот с калитками (площадью 20 кв.м) по адресу: г. Слоним, ул. Советская, 103А, корп. 3;<br>- капитального строения, инв. № 450/С-1100 – здание для хранения материалов (площадью 156,5 кв.м) по адресу: г. Слоним, ул. Советская, 103А;<br>- капитального строения, инв. № 450/С-1103 – здание для хранения (площадью 385,7 кв.м) по адресу: г. Слоним, ул. Советская, 103А, корп. 1 |
| **Начальная цена продажи** | 5945,38 р. (пять тысяч девятьсот сорок пять рублей тридцать восемь копеек) |
| **Размер ежемесячной арендной платы либо применяемые коэффициенты** | Коэффициент в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды – 2,5 |
| **Сумма задатка** | 595 р. (пятьсот девяносто пять рублей) |
| **Условия аукциона** | Целевое назначение арендуемых помещений – складские, производственные помещения |
| **Продавец** | Отдел материально-технического снабжения УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», 225410, г. Барановичи, ул. Фроленкова, 52Б, Тел. 8-0163-45-20-08 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | Плата за право заключения договора аренды – в течение 7 рабочих дней до даты заключения договора аренды |
| **Срок заключения договора аренды** | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 07 февраля 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 01 февраля 2017 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

# ЖЫВЫЯ СВЕДЧАННІ

## Малалетнія вязні нацызму стварылі серыю кніг, дзе расказалі пра сваё апаленае вайной дзяцінства

**Каля сотні былых вязняў гета, канцэнтрацыйных лагераў і прымусовых рабочых прынялі ўдзел у форуме былых вязняў нацызму. Падчас сустрэчы, якая адбылася ў храме-помніку Усіх Святых, была прэзентавана серыя кніг «Жывыя сведчанні Беларусі».**



На працягу некалькіх гадоў удзельнікі і сведкі падзей Вялікай Айчыннай вайны дзяліліся сваімі ўспамінамі, якія ў выніку выдадзены ў дзевяці кнігах. Першая — «Вайна і ўкрадзеныя гады» — утрымлівае каля 70 успамінаў, дакументаў, фотаздымкаў. Яе аўтарамі ў асноўным сталі былыя прымусовыя рабочыя ў Германіі, а сёння — жыхары Савецкага раёна сталіцы.

Эстафету падхапілі іншыя раёны Мінска. У падрыхтоўцы кніг вязням нацызму дапамагалі адміністрацыі раёнаў, раённыя арганізацыі былых малалетніх вязняў фашызму, Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна, школьнікі і настаўнікі.

Своеасаблівы летапіс Вялікай Айчыннай вайны, заснаваны на ўспамінах удзельнікаў і ахвяр тых жудасных падзей, стварылі і ў 25-й мінскай гімназіі. Пад кіраўніцтвам настаўніцы беларускай мовы і літаратуры , кіраўніка народнага гісторыка-краязнаўчага музея «Невычэрпная крыніца гісторыі» Аліны Пахвалёнай навучэнцы ладзяць экскурсіі па мемарыяльным комплексе «Трасцянец». Акрамя таго, яны адкрылі новыя факты з гісторыі лагера смерці, адшукалі біяграфіі некаторых трасцянецкіх ахвяр.

Праект «Жывыя сведчанні Беларусі» атрымаў такі розгалас у грамадстве, што некаторыя кнігі нават былі перавыдадзены і дапоўнены. Напрыклад, успаміны былых вязняў канцлагера «Асвенцым» апублікаваны ўжо тройчы. Кіраўнік Беларускага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання былых малалетніх вязняў фашызму Аляксандра Барысава, якая мае непасрэднае дачыненне да выдання кнігі, пра Асвенцым ведае не па чутках. Аляксандра Васільеўна — вязень трох лагераў. З Асвенцыма, або Аўшвіца, як называлі самы масавы канцэнтрацыйны лагер палякі (тут было знішчана каля 1,4 мільёна чалавек), яе, знясіленую і паўсляпую, у студзені 1945-га вызвалілі салдаты Чырвонай Арміі.

— У гады Другой сусветнай вайны існавала каля 40 тысяч месцаў масавага знішчэння людзей, — расказаў дырэктар Гістарычнай майстэрні імя Леаніда Левіна, дацэнт гістарычнага факультэта БДУ Кузьма Козак. — Толькі на тэрыторыі Беларусі падчас акупацыі нацысты стварылі 260 такіх месцаў. З іх 140 — гета. А колькі беларусаў утрымлівалася ў канцэнтрацыйных лагерах Еўропы!

Ужо сабраны ўспаміны нашых землякоў, якім цудам удалося выжыць у такіх «фабрыках смерці», як Дахау, Бухенвальд, Равенсбрук, Майданэк, Сабібор, Заксенхаўзен. Неўзабаве і яны выйдуць у серыі «Жывыя сведчанні Беларусі», а гэта значыць, што моладзь яшчэ больш даведаецца пра выпрабаванні, якія некалькі дзесяцігоддзяў таму вытрымалі іх продкі.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Крокі да Шагала

# Дом мастака...

## вачыма нямецкай разведкі

**Сёлета мы будзем адзначаць 130-годдзе з дня нараджэння Марка Шагала. Ён з'явіўся на свет 7 ліпеня 1887 года (па новым стылі). «Звязда» распачынае серыю публікацый, прысвечаных юбілею Майстра.**



Фрагмент здымка. Белым квадратам выдзелены ўчастак сям'і М. Шагала.

У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі з'явіліся копіі ўнікальных фота, якія захоўваюцца ў Нацыянальным упраўленні архіваў і дакументацыі ЗША. Фотаздымкі, зробленыя ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны з нямецкага самалёта, даюць уяўленне, паміж іншым, і пра тое, як выглядаў дом сям'і Шагала.

### Дар Беларусі з-за акіяна

Здымкі — падарунак замежных мецэнатаў.

— Музей вельмі ўдзячны Віталю Гарадзецкаму з Лос-Анжэлеса (ЗША). Пяць сканаў фотаздымкаў вельмі высокай якасці. Самастойна нашай музейнай установе было б у разы складаней атрымаць здымкі. Напэўна, давялося б прасіць дапамогі ў дыпламатаў. А потым — вырашаць за акіянам шматлікія бюракратычныя, фінансавыя і тэхнічныя нюансы, — расказвае **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Валерый ШЫШАНАЎ**.

Спадар Гарадзецкі — актыўны ўдзельнік «шагалаўскай» ініцыятыўнай групы. Яна яднае прыхільнікаў творчасці вядомага мастака — жыхароў былога СССР, якія эмігравалі ў ЗША.

— Група мае назву «Шагал 2012» (лічба сімвалізуе год, калі святкавалася 125-я гадавіна з дня нараджэння Майстра). Энтузіясты актыўна ўдзельнічалі ва ўстанаўцы мемарыяльнай дошкі, прысвечанай вядомаму мастаку, на доме, у якім ён жыў з 1915 па 1918 год у Пецярбургу (да вяртання ў Віцебск), — працягвае музейны работнік. — Бацькі гэтых людзей нарадзіліся ў Віцебску, Гомелі, Рагачове і Жлобіне. Вось дзеці і падтрымліваюць сувязі з віцебскай інтэлігенцыяй, дораць цікавыя экспанаты. І мы ім вельмі ўдзячныя за дапамогу.

### Яшчэ не разбураны горад

Суразмоўца падкрэслівае: здымкі каштоўныя тым, што на іх можна ўбачыць Віцебск з вышыні птушынага палёту ў першыя дні вайны. Горад яшчэ не быў разбураны падчас бамбардзіровак. На фота, зробленых з самалёта нямецкай паветранай разведкі, можна ўбачыць «контуры» кварталаў, дамоў. На жаль, многія з іх не захаваліся да нашых дзён.

Здымкі, зразумела, можна будзе выкарыстоўваць і пры планіроўцы забудовы «Шагалаўскага квартала». Размова ідзе пра турыстычны комплекс (з кавярнямі, гатэлямі, дамамі рамеснікаў) каля дома-музея Марка Шагала — на вуліцы Пакроўскай. Асабліва квартала ў тым, што ён будзе адпавядаць «шагалаўскаму часу» — стане прыкладна такім, як ён выглядаў у дарэвалюцыйныя гады.

Здымкі часоў пачатку вайны стануць падказкай для праекціроўшчыкаў, архітэктараў, гісторыкаў, якія будуць працаваць над незвычайным горадабудаўнічым праектам. Асаблівую цікавасць уяўляе адзін здымак. На ім можна разгледзець участак, які належыў сям'і Марка Шагала, з забудовай, што захавалася да акупацыі горада.

### Усё больш падарункаў

«Звязда» ўжо пісала пра аналагічны падарунак з Германіі.

— Навіна тады выклікала вялікі грамадскі рэзананс. Марына Сайлер, наша зямлячка, якая працяглы час жыве ў Германіі, спрыяла набыццю 7 фота. Але іх зрабілі 24 ліпеня 1941 года, калі горад ужо быў заняты фашыстамі і значна разбураны. На здымках: тэатр, праваслаўныя, каталіцкія храмы і сінагогі, цырк... Дарэчы, цырк знаходзіўся на сучаснай вуліцы Леніна. У тым месцы цяпер жылы дом, на 1-м паверсе яго некалькі кавярняў, турыстычная фірма, — удакладняе Валерый Шышанаў.

На жаль, у музея не так шмат грошай, каб набыць, напрыклад, на інтэрнэт-аўкцыёнах здымкі перыяду Другой сусветнай вайны. Звычайна яны састаюцца ў прыватных калекцыях. І няма магчымасці зрабіць хаця б копіі.

Цяпер, сведчаць захавальнікі каштоўнасцяў, уваходзіць у моду дарыць музеям рарытэты. Сярод апошніх ахвяраванняў прадметы дамашняга быту даваеннага часу, фота, зробленыя ў 1920—1930-я гады. Часам цяжка нават устанавіць, хто на здымках, але яны даюць уяўленне пра «дух мінулага». Пра адзенне, прычоскі, інтэр'еры. Пра адзенне, прычоскі, ...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# НОВЫЯ ХРАМЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ

**На ўскраіне сталіцы міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», а таксама ў яе цэнтры пабудуюць касцёлы. І ў Паставах — таксама.**

Як паведаміў «Звяздзе» іерарх каталікоў Прыдзвіння, біскуп Віцебскі Алег Буткевіч, касцёл узвядуць у адным з мікрараёнаў, якія вядомыя пад агульнай назвай «Білева». Менавіта там у апошнія гады будуюць шмат жылля. На жаль, у «Білеве» даўгабудам стаў новы заапарк — у перспектыве самы буйны ў краіне. Але, як заверыў біскуп, калі ўжо пачнуць будаваць касцёл, гэта зойме параўнальна не шмат часу, бо фінансаванне будзе своечасовым.

Адказваючы на пытанні «Звязды», біскуп пацвердзіў, што ёсць намер аднавіць касцёл у гістарычным цэнтры — насупраць сімвала горада — ратушы. Пра адпаведныя планы «Звязда» паведамляла. Цяпер віцебская вернікі чакаюць дазволу ад кіраўніцтва краіны. І ўжо распрацоўваецца праект. З нуля адновяць прыгожы храм у гонар Святога Антонія. Ён быў пабудаваны ў XVIII стагоддзі, разбураны — у 1960-я гады. На яго месцы сёння можна ўбачыць фантан, які сімвалізуе тры ракі: Заходнюю Дзвіну, Лучосу і Віцьбу. У гонар апошняй горад атрымаў назву.

Будзе і яшчэ адзін касцёл у Віцебску: адновяць капліцу, пабудаваную ў пазамінулым стагоддзі. Яна часткова захавалася. Знаходзіцца ў віцебскім батанічным садзе. Юрыдычна гэта тэрыторыя замацавана за Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П.М. Машэрава. У ВНУ былі планы знесці будынак, які не выкарыстоўваўся. Але была задаволена просьба каталіцкай епархіі: перадаць ёй правы на эксплуатацыю.

У райцэнтры Паставы новы касцёл плануюць будаваць у найбліжэйшы час. Максімум, паводле слоў біскупа, на гэта спатрэбіцца 2—4 гады.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# ПАД ЗОРКАЙ УЛАДЗІМІРА МУЛЯВІНА

**Мінулы год быў знакавым, юбілейным для беларускай эстрады і ўвогуле для беларускай культуры: у 2016-м — 75 гадоў з дня нараджэння народнага артыста СССР, заснавальніка ансамбля «Песняры» Уладзіміра Мулявіна.**

І ў самым канцы мінулага года з'явілася проста ўнікальная кніга — зборнік нарысаў, дыялогаў, партрэтаў, эсэ і артыкулаў Вольгі Брылон і Марыны Мулявінай «Уладзімір Мулявін і Лідзія Кармальская. Нявыказанае...: даследаванні, успаміны, публіцыстыка». Выдавецтва «Альтиора Форте» ўзбагаціла выданне велізарнай калекцыяй фотаздымкаў, большасць якіх шырокаму колу прыхільнікаў таленту спевака, музыканта, кампазітара былі проста незнаёмыя дагэтуль. Аўтары з дапамогай самых розных сяброў (і пры шырокім выкарыстанні дакументаў) вядуць расповед пра Уладзіміра Мулявіна: пра самыя юныя яго гады, першыя гады жыцця і творчасці ў Беларусі.

Лідзія Кармальская — першая жонка легендарнага «песняра». У многім фарміраваннем свайго таленту Уладзімір Георгіевіч абавязаны менавіта гэтаму чалавеку, маці яго дваіх дзяцей. Марына Мулявіна так напісала ў кароткім уступным слове да кнігі: «...Я зразумела, што не маю права хаваць у сабе гісторыю кахання маіх бацькоў. Яна, гэтая гісторыя, назаўсёды засталася ў маёй памяці як прыклад чыстых і светлых рамантычных адносін паміж мужчынам і жанчынай. І я павінна расказаць пра гэта сваім дзецям і ўнукам». Але так атрымалася, што апавяданне вылілася далёка за межы асабістага светабачання, асабістых ацэнак. Мо так здарылася яшчэ і таму, што аўтары — М. Мулявіна і В. Брылон — часта даюць слова самым розным знаёмым, сябрам, калегам Уладзіміра Георгіевіча. Цэлы калейдаскоп яркіх асоб праходзіць перад чытачом: заслужаны артыст Беларусі Аляксандр Яравы, народны артыст Расіі кампазітар Ігар Раеўскі, заслужаны артыст Беларусі Уладзіслаў Місевіч... У кнізе прыведзена перапіска Уладзіміра Мулявіна і Лідзіі Кармальскай, якая ўспрымаецца як асобны сапраўдны раман.



Кнігу нельга чытаць без хвалявання. Кожная яе старонка — сведчанне таго, як рос, фарміраваўся талент, колькі было розных перашкод на шляху да стварэння ансамбля «Песняры». Шчырыя інтанацыі, адкрытасць, здольнасць і аўтараў, і іх суразмоўцаў прыўзняцца над часам, адкрыта падзяліцца сваімі думкамі робіць выданне найлепшым сярод усіх спроб напісаць калектыўны партрэт легендарнага «песняра».

**Сяргей ШЫЧКО.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 400/С-4112 (назначение – здание нежилое, наименование – контрольно-производственная лаборатория), площадью 149,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. 1 Мая, д. 28, корп. 1 с оборудованием: распределительный ящик ЩРНМ-5 (1000х650х300)IP31, рубильник РПЦ-1 (2 шт.) |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 440100000002008456 (назначение – земельный участок для обслуживания здания контрольно-производственной лаборатории), площадью 0,0336, расположенный по адресу: г. Гродно, ул. 1 Мая, д. 28/1. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земельный участок, расположенный в охранной зоне сетей и сооружений канализации, код – 13,5 площадью 0,0051 га. |
| Начальная цена продажи | 93 127 р. (девяносто три тысячи сто двадцать семь рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 4 656 р. (четыре тысячи шестьсот пятьдесят шесть рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | Гродненское областное потребительское общество, 230023, г. Гродно, ул. 1 Мая, 28, тел. 72-30-50, факс 72-00-67 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 19 января 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209** | |

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 08.07.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 16 января 2017 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

# БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

## сообщает о проведении 6 февраля 2017 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома** | | | | | | |
| 1 | Минская область, Логойский район, Беларучский с\с, д. Корбачевка, земельный участок У-3, кадастровый номер 623280403601000065, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1207 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 6 500,00 | 1 429,04 + публикация в газете | 650,00 |
| 2 | Минская область, Логойский район, Беларучский с\с, д. Корбачевка, земельный участок У-9, кадастровый номер 623280403601000071, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1446 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 7 600,00 | 1 443,32 + публикация в газете | 760,00 |
| 3 | Минская область, Логойский район, Беларучский с\с, д. Вяча, ул. Центральная, д. 5В, кадастровый номер 623280402101000190, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1494 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 9 000,00 | 1 606,54 + публикация в газете | 900,00 |

*Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № 3600619011121 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 795, код платежа 4901, УНН 600181549, получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.*

Аукцион состоится **6 февраля 2017 года в 10.00** по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.

Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.

Последний день приема заявлений – **31 января 2017 года до 17.00.**

Контактные телефоны: **(801774) 58445, 58435, 58436.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 420/С-3357 (назначение – здание нежилое), площадью 58,0 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Дворищанский с/с, южнее деревни Юровичи. Составные части и принадлежности: терраса |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 423683000044000001 (назначение – земельный участок для обслуживания охотничьего домика), площадью 0,0613 га, расположенный по адресу: Лидский р-н, Дворищанский с/с, южнее деревни Юровичи |
| Начальная цена продажи | 17 636,40 р. (семнадцать тысяч шестьсот тридцать шесть рублей сорок копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 1 763 (одна тысяча семьсот шестьдесят три рубля) |
| Продавец | ОАО «Лидский завод электроизделий», 231300, г. Лида, ул. Фабричная, 4, тел. 8-0154-52-13-47 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия аукциона | Вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи |
| Условия оплаты | Полный расчет по договору купли-продажи в течение 5 (пяти) банковских дней после заключения договора |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 06 февраля 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209** | |

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 01 февраля 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## (о проекте строительства объекта «Застройка микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь. Жилой дом № 12 по генплану»)

**Информация о застройщике**

Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 28 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
2. Жилой дом № 7 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.
3. Жилой дом № 9 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 8 месяцев.
4. Жилой дом № 32 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 11 месяцев.
5. Жилой дом № 11 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.
6. Жилой дом № 85 по ул. Неманской, фактический срок строительства – 18 месяцев.
7. Жилой дом № 21 по ул. Налибокской, фактический срок строительства – 18 месяцев.
8. Жилой дом № 24 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
9. Жилой дом № 60 по ул. Каменногорской, фактический срок строительства – 11 месяцев.
10. Жилой дом № 34 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 8 месяцев.
11. Жилой дом № 3 по ул. М. Пташука, фактический срок строительства – 19 месяцев.
12. Жилой дом № 5 по ул. М. Пташука, фактический срок строительства – 22 месяца.

**Информация о проекте и об объекте строительства**

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома.

Положительные заключения государственной экспертизы № 680-15/15 от 24.09.2015 г., № 701-15/16 от 25.11.2016 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Ленинский район, жилой дом № 12 по генплану в застройке микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь строительства.

**Характеристика объекта**

Объект – 274-квартирный, 10-этажный крупнопанельный жилой дом, состоит из семи секций, серии М464М-10 со встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, строятся без выполнения подготовительных работ под отделку стен, полов и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды), без электрической плиты.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

**1-комнатные квартиры при поэтапной оплате – 1 900,13 руб.**

**1-комнатные квартиры при 100% оплате в течение месяца – 1 700,2 руб.**

**2-комнатные квартиры при поэтапной оплате – 1 600,27 руб.**

**2-комнатные квартиры при 100% оплате в течение месяца – 1500,19 руб.**

**3-4-комнатные квартиры при поэтапной оплате – 1450,34 руб.**

**3-4-комнатные квартиры при 100% оплате в течение месяца – 1 295 руб.**

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома №770 от 15 марта 2012 г., свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 24 сентября 2014 г. № 500/1393-3956. Площадь земельного участка – 0,5318 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Количество квартир в доме – 274.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности: помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Начало строительства жилого дома – 1-й квартал 2016 г., предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 3-й квартал 2017 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома №770 от 15 марта 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Строительство осуществляется согласно Указу Президента № 263 от 6 июня 2013 г. Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 140 квартир, из них 26 однокомнатных квартир общей площадью 49,21 м² жилой площадью 22,55 м², 7 двухкомнатных квартир общей площадью 68,94 м² жилой площадью 40,15 м², 3 двухкомнатные квартиры общей площадью 69,14 м² жилой площадью 35,51 м², 39 трехкомнатных квартир общей площадью 92,2 м² жилой площадью 56,03 м², 26 трехкомнатных квартир общей площадью 92,75 м² жилой площадью 50,46 м², 17 трехкомнатных квартир общей площадью 99,35 м² жилой площадью 50,23 м², 17 трехкомнатных квартиры общей площадью 97,21 м² жилой площадью 50,23 м², 5 четырехкомнатных квартир общей площадью 109,34 м² жилой площадью 69,19 м².

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир**

Прием заявлений от граждан осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205а, кабинет №1, тел. 207-19-15) с 10 января 2017 г., ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by**

# СУМНАЕ СІРТАКІ

## Чаму Грэцыя зноў стала «галоўным хворым» Старога Свету?



**Разважанні аб тым, што менавіта Італія заняла месца асноўнага «хворага» Еўропы, нібыта вызваленае Грэцыяй, на думку шэрагу аналітыкаў, ужо не актуальныя. Пасля аглушальнага паражэння на Апенінах кіруючай партыі на рэферэндуме і адстаўкі прэм'ера Матэа Рэнца еўра знізіўся, але зноў аднавіў свае пазіцыі. Што ж датычыцца італьянскіх аблігацый, то яны амаль не адрэагавалі на гучную падзею. Большасць каштоўных папер у іншых краінах таксама ледзь заўважылі хваляванні на Апенінах. Так што Грэцыя зноў вяртаецца на звыклае месца «галоўнага хворага» Еўропы. Ці здолее краіна выйсці з такога становішча?**

### З ЛІДАРАЎ — У АЎТСАЙДАРЫ

Яшчэ нядаўна расклад для Грэцыі выглядаў зусім па-іншаму. Краіна была далёка не аўтсайдарам, а адным з лідараў на кантыненце. Пасля Другой сусветнай вайны ў Еўропе неаднойчы ўзгадвалі пра грэчаскі «эканамічны цуд». Сярэднегадавыя тэмпы прырosту валавога ўнутранага прадукту ў гэтай краіне паміж 1950-м і 1973-м склалі рэкордныя для Старога Свету 7 працэнтаў. З тых часоў Грэцыя распачала шэраг структурных і фінансавых рэформаў, атрымліваючы пры гэтым значную фінансавую падтрымку Еўрапейскага саюза. У 2001 годзе краіна далучылася да Еўразоны. Штогадовы прырост ВУП доўгі час перавышаў адпаведны ўзровень большасці яе партнёраў у ЕС.

У пачатку 2000-х Грэцыя была адным з вядучых інвестараў у эканомікі амаль усіх яе балканскіх суседзяў. Нацыянальны банк Грэцыі ў 2006 годзе набыў 46% акцый турэцкага Фінансбанка і 99,44% акцый сербскага Vojvodanska Bank. Па дадзеных універсітэта Гронінген, у перыяд 1995—2005 гадоў Грэцыя стала краінай з найбольшым рабочым часам сярод іншых еўрапейскіх краін: грэкі працавалі ў сярэднім 1900 гадзін у год, другое месца занялі іспанцы — 1800 гадзін (для параўнання: гэта больш, напрыклад, чым у японцаў, якія заўжды лічыліся працаголікамі). У 2007 годзе сярэдні работнік у Грэцыі зарабляў каля 20 долараў за гадзіну. Па дадзеных індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу краіна займала 25-е месца ў свеце.

Грэчаская эканоміка пабудавана ў сучасным трэндзе, дзе сфера паслуг складае найбольшую долю і ўяўляе сабой найбольш важны і ў той жа час хуткарослы сектар. На дзяржаўны сегмент Грэцыі прыпадае каля 40% ВУП, аднак урад прадпрымае ўсе меры па далейшым зніжэнні яго долі. У прамысловым сектары пераважаюць высокія тэхналогіі вытворчасці абсталявання, асабліва ў галіне тэлекамунікацый. Сярод іншых важных галін — тэкстыльная, хімічная прамысловасць, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, машынабудаванне, транспартнага абсталявання і электрычных прыбораў. 10% ВУП прыносіла Грэцыі будаўніцтва, паколькі гэты сектар перажываў сапраўдны бум у сувязі з Афінскай Алімпіядай 2004 года. Сельская гаспадарка фарміруе толькі 7% ВУП.

Цікава, што мігранты складаюць амаль адну пятую частку рабочай сілы ў Грэцыі, яны занятыя ў асноўным у сельскай гаспадарцы і будаўніцтве. Працоўныя рэсурсы Грэцыі на 2009 год склалі 4,577 мільёна чалавек, або 46% ад агульнай колькасці насельніцтва. Гэта другі паказчык сярод краін Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця пасля Паўднёвай Карэі (48%). Сярэдні даход на душу насельніцтва стабільна павялічваўся: напрыклад, гэты паказчык вырас з 30 661 долара ў 2008 годзе да 31 704 долараў у 2009-м. Па пакупніцкай здольнасці насельніцтва дзяржава ў тым жа 2009 годзе заняла 25-е месца ў свеце.

У 2001 годзе Грэцыю прызналі развітой краінай. Але ўжо ў 2013-м яна стала першай у свеце дзяржавай, якая страціла такі статус. З-за сусветнага фінансавага крызісу эканоміка Грэцыі напрыканцы 2009 года апынулася ў вельмі цяжкім становішчы: дэфіцыт бюджэту склаў 12,7% ВУП, пры гранічных у Еўразоне 3%. Урад пачаў шырокую праграму прыватызацыі, двойчы выпускаючы глабальныя аблігацыі, аднак вясной 2010-га эканоміка апынулася на мяжы дэфолту, што абваліла еўравалюту да гадавога мінімуму. Колькасць беспрацоўных у Грэцыі пачала імкліва павялічвацца: з 9,8% у кастрычніку 2009 года — да 12,6% у верасні 2010 года і 13,5% у кастрычніку 2010 года. Дарэчы, пасля гэтых паказчык працягнуў свой рост.

### ПРАВА НА КАЛЯДНЫ ПАДАРУНАК

16 краін Еўрасаюза і МВФ дамовіліся аб выдзяленні Грэцыі фінансавай дапамогі ў памеры 110 млрд еўра (80 млрд ад ЕС і яшчэ 30 млрд ад МВФ) пры ўмове ўвядзення жорсткай праграмы эканоміі. Яна прадугледжвала скарачэнне, замарожванне заробтаной платы, павышэнне пенсійнага ўзросту, павелічэнне падаткаў, што абярнулася для краіны хваляй забастовак, масавых акцый пратэсту і беспарадкаў. Дзеля напаўнення «падатковай карзіны» ўрад абвясціў падатковую амністыю, а таксама пачалася актыўная барацьба з карупцыяй. Найбольшы грамадскі рэзананс атрымалі справа Ватапедскага манастыра на Афоне, а таксама скандал з кампаніяй «Siemens» у Грэцыі.



Усяго з 2010-га міжнародныя крэдыторы ўзгаднілі тры планы фінансавай дапамогі Грэцыі. У сярэдзіне 2015 года краіны ЕС узгаднілі чарговую праграму ў памеры 86 мільярдаў еўра. У маі 2016-га міністры фінансаў пагадзіліся нават на кароткі час вызваліць Афіны ад выплаты працэнтаў. Раней Фонд фінансавай стабілізацыі краін Еўразоны (ESM) ухваліў пералік Грэцыі чарговага траншу крэдыту ў памеры 2,8 мільярда еўра. Савет дырэктараў фонду прыняў гэтае рашэнне на падставе таго, што Афіны дэманструюць прагрэс у правядзенні неабходных рэформаў.

Праўда, рэалізацыя апошняга пагаднення была ўскладнена нядаўнім скандалам, справакаваным рашэннем Афін насуперак меркаванню крэдытораў выдаць перад Калядамі 1,6 млн грэчаскіх пенсіянераў аднаразовую грашовую дапамогу. Тым, хто атрымлівае менш чым 850 у месяц, было дадаткова выплачана ў сярэднім па 385. На гэтыя мэты, а таксама на субсідыі астравоў, якія прымаюць нелегальных мігрантаў, з бюджэту запланавана былі выдзелены 600 мільёнаў еўра.

Вядома, крэдыторы абурыліся, бо на краіне вісіць дзярждоўг — 315 млрд (180% ВУП). Паводле ацэнак ЕС, у выпадку рэалізацыі комплексу ўзгодненых мер і далейшых рэформаў агульны доўг Грэцыі да 2060 года можа скараціцца да 20% ВУП. Але ва ўрадзе Грэцыі пярэчаць: пагадненне з еўракрэдыторамі дазваляе павялічваць выдаткі ў выпадку росту даходаў вышэй, чым запланавана. Па выніках 11 месяцаў 2016 года даходы бюджэту Грэцыі аказаліся вышэй запланаваных на 1,5 млрд, з якіх 617 млн прэм'ер-міністр Алекс Цыпрас прапанаваў выдзеліць на калядных выплаты пенсіянерам. «Вы не можаце прасіць нас аб тым, што не можа быць зроблена ў рамках эканомікі, якая нясе на сабе сляды ран, атрыманых у выніку вашых жа памылак», — заўважыў кіраўнік грэчаскага ўрада.

Вядома, ніхто не хоча, каб яшчэ адна праграма аказання дапамогі Грэцыі, на гэты раз 86-мільярдная, правалілася. Асабліва ў той час, калі геапалітычная важнасць краіны пачала расці. Гэта датычыцца, ці не ў першую чаргу, вялізнай хвалі бежанцаў, для якіх менавіта Грэцыя — пярэдні край Старога Свету. Мігранты працягваюць прыбываць на грэчаскія астравы ўсходняй і паўночна-ўсходняй часткі Эгейскага мора. Прычым апошнім часам назіраецца трывожная з'ява — павелічэнне колькасці мігрантаў не з краін Блізкага Усходу, ахопленых ваеннымі дзеяннямі. Нацыянальная прыналежнасць мігрантаў уражвае: Конга, Эфіопія, Эрытрэя, Алжыр, Гана, Гвінея, Малі, Бангладэш, Сьера-Леонэ, Гамбія, Нігерыя, Судан, Ангола і нават Ямайка.

Прадстаўнікі Грэцыі і Еўразоны абмеркавалі гарантыі, якія могуць даць Афіны ў якасці абавязацельстваў, што калядныя выплаты пенсіянерам — адначасовая мера, якая не паўторыцца. Грэцыя запэўніла крэдытораў у прыхільнасці ўзгодненай раней эканамічнай праграме. У краіны з'явіўся шанц трохі знізіць дзярждоўг. Міністры фінансаў краін Еўразоны выказалі гатоўнасць аднавіць перамовы аб першых кроках па зніжэнні пазыковай нагрузкі Грэцыі. Такія перамовы могуць працягнуцца ў студзені. «Рады паведаміць, што мы знялі перашкоды ў адносінах да працэдуры прыняцця рашэнняў па кароткатэрміновых мерах у дачыненні доўгу», — гаворыцца ў заяве кіраўніка Еўрагрупы (аб'яднаю міністраў фінансаў Еўразоны) Ерун Дзейсельблума.

### У ЧАКАННІ «ГРЭКЗІТУ»?

Летась грэчаская эканоміка стабілізавалася і вярнулася да росту, падкрэсліў прэм'ер-міністр Алексіс Цыпрас у сваім выступленні ў парламенце. Дзякуючы перш за ўсё сферы паслуг. Мінулы год адзначыўся павелічэннем ўязнога турызму: Грэцыю наведала больш за 27 млн замежных гасцей, што стала рэкордным паказчыкам у гісторыі краіны. Па ацэнцы Грэчаскай Нацыянальнай турыстычнай арганізацыі (GNTO), зыходзячы з бранiравання 2017-га, сёлетні год абяцае быць яшчэ больш паспяховым: колькасць заявак ад замежных тураператараў на перыяд з красавіка па лістапад ужо ўзрасла на 19% у параўнанні з аналагічным перыядам 2016-га. Як заявіў генеральны сакратар GNTO Дзімітрыс Трыфонапулас, у яго ведамстве ўжо бачаць «істотныя тэмпы росту, якія амаль у два разы перавышаюць сярэдні сусветны паказчык». Па дадзеных GNTO, уклад турызму ў ВУП Грэцыі летась склаў 20%.

Алексіс Цыпрас заўважыў, што 2017-ы стане знакавым годам для выхаду з крызісу, што сёлетні бюджэт аптымістычны — гэта бюджэт росту і аднаўлення эканомікі. Паводле яго слоў, чакаецца і скарачэнне беспрацоўя. Разам з тым ён заявіў, што Грэцыя не пойдзе на такія рэформы на рынку працы, якія адкінуць яе ад еўрапейскіх завяеў.

Маркуючы па тым, як развіваліся падзеі ў снежні 2016-га, паўтара года адноснага спакою ў Грэцыі хутка падыходзяць да канца. Старому Свету варта рыхтавацца ў 2017 годзе да магчымасці чарговага «грэкзіту», лічаць асобныя аналітыкі. Зрэшты, прэм'ер Цыпрас настроены аптымістычна і ўпэўнены, што яму ўдасца уладзіць чарговы крызіс у адносінах з крэдыторамі. Відавочна, кіраўніка грэчаскага ўрада натхніла падтрымка Франсуа Аланда, які заявіў на саміце ЕС, што аб далейшых патрабаваннях ад грэкаў не можа быць і гаворкі, а таксама шэрагу іншых левых лідараў Еўропы.

Грэкі застануцца вернымі самім сабе. У гэтым, прынамсі, пераконвае віншавальная калядная паштоўка, разасланая Мінфінам Грэцыі. На ёй — выява Эбінейзера Скруджа, героя «Каляднай песні» Чарльза Дзікенса. Як вядома, гэта персанаж, які ўвасабляе скваліпнасць і прагнасць і не здольны падзяліць радасць навакольных з нагоды будучага свята. «Дарагія сябры, — гаворыцца ў віншавальным тэксце, — нашы пажаданні перамогуць усіх «эбінейзераў» гэтага свету і іх маркотную адзіноту». Грэкі не губляюць аптымізму і, безумоўна, станцуюць сваё сіртакі. Няхай пакуль сумнае.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*



Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

***Летась суседка па парадзе агароднікаў пры пасадцы расады памідораў паклала ў лунку па жмені сухароў і драўнянага попелу, у сярэдзіне лета сцёблы былі ў дыяметры да 2,5 см і вышынёй з 2 метры. Ураджайнасць вельмі парадавала.***

### Вучымся на чужых памылках

***Не толькі пачаткоўцы, але і дасведчаныя агароднікі часта робяць памылкі, якія прыводзяць да непапраўных наступстваў. Вось некаторыя з іх.***

1. Часта ўносяць мінеральныя ўгнаенні без уліку надвор'я. А між тым у халоднае надвор'е падкормкі бескарысныя, бо пажыўныя рэчывы дрэнна паступаюць да расліны. Карані большасці агародніных культур лепш «працуюць», калі тэмпература глебы вышэй за 10 °С.

2. Пры падкормцы раслін разведзенымі ў вадзе мінеральнымі ўгнаеннямі з палівачкі раствор часта трапляе на лісце. Гэта суправаджаецца апёкамі. Залатое правіла агародніка абвяшчае, што падкормліваць растворам угнаеняў трэба акуратна пад корань, а калі неспадзявана ён трапіў на лісце, рэкамендуецца адразу змыць чыстай вадой з палівачкі.

3. Падкормкі вадкімі ўгнаеннямі па сухой глебе прыводзяць да апёкаў каранёў. Спачатку трэба намачыць глебу вадой, а затым падкормліваць.

4. Раслінныя рэшткі, заражанае ўзбуджальнікамі хваробаў бацвінне часам пераконпваюць, змешваючы з глебай, з прычыны чаго адбываецца назапашванне інфекцыі. Хворыя расліны трэба выдаляць на працягу ўсёй вегетацыі, а восенню спальваць ці закопваць далей ад агарода (не бліжэй за 50 м ад участка).

5. Нязменнае вырошчванне на ўчастку адной культуры, напрыклад бульбы, прыводзіць да спустачэння глебы і назапашвання ўзбуджальнікаў хваробы. У гэтым выпадку цяжка бывае атрымаць высокі ўраджай здаровых клубняў. Трэба пазбягаць суседства раслін аднаго і таго ж сямейства. Напрыклад, рэпа, радыска, капуста пашкоджваюцца кілой, і іх непажадана вырошчваць на адной градцы.

## АГАРОДНІК — АГАРОДНІКУ

### Бананавыя ўгнаенні

Узяць бананавыя лупіны, заліць іх вадой (напрыклад, у трохлітровым слоіку), пачакаць, калі на паверхні з'явяцца бурбалкі і палiваць пакаёвыя кветкі. Прапорцыі адвольныя.

Можна ваду наліваць у старыя лупіны, дадаўшы новыя.

### Кветкі на дрожджах

100 г сырых дрожджэй растварыць у 10 л вады. Палiваць усе расліны, у тым ліку і пакаёвыя кветкі, раз у месяц. Вынік — выдатны рост.

### Прафілактыка часнаком

Часночны настой умацоўвае імунітэт раслін. Заліць 4—5 зубчыкаў часнаку 1 л кіпеню і даць настаяцца 20 хвілін. Атрыманы раствор дадаваць у ваду для палівання па 1 ст. л. на 1 літр вады — для любых раслін.

### Ёд для капусты

У вядро вады дадаць 40 кропель ёду. Калі пачне фарміравацца качан, палiваць капусту пад расліну па 1 літры.

### Паскарэнне прарастаемасці

Каб насенне хутчэй прарасло, яго замочваюць у растворы перакісу вадароду (4%) на 12 гадзін (капуста), а насенне памідораў і буракоў — на 24 гадзіны. Для абеззаражвання насення (замест марганцоўкі) яго апрацоўваюць 10-ным перакісам вадароду 20 хвілін. Судносіны раствору і насення 1:1. Затым насенне прамываюць і прасушваюць.

### Чай для цыбулі

Чайную заварку высушыць і захоўваць для пасадкі цыбулі. Уносіць пад кожную цыбуліну пры пасадцы. Цыбуля не хварэе.

### Пасля дажджыку

Ураджай бульбы будзе ў тры разы большы, калі ўсходы бульбы (10—12 см) абагнаць адразу ж пасля дажджу або шчодрага паліву. Тады ўтвараюцца датковыя сцвалы, на якіх праз некаторы час з'явяцца клубні.

### Салёная зямля

Калі ў буракоў пачырванела лісце, значыць, у глебе не хапае натрыю. Трэба паліць буракі саляным растворам. Для гэтага шклянку буйной солі развесці ў 10 літрах вады. Гэтага дастаткова, каб падсаліць зямлю.



## Філатэліст

### З ПАЖАДАННЕМ УДАЧЫ!

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 3 студзеня выпусціла ў абарачэнне паштовую марку «Удачы ў посткросінгу» — міжнародным анлайн-праекце, дзякуючы якому можна абменьвацца паштовымі карткамі і маркамі з людзьмі з розных куткоў планеты. Для гэтага дастаткова зарэгістравацца на сайце www.postcrossing.com і па адрасах, якія прапануе сістэма сайта, адправіць першыя пяць паштовак. Як толькі першая з іх дойдзе да атрымальніка (ён зарэгіструе яе код на сайце), можна чакаць, што ў хуткім часе атрымальнікам станеш сам.




У дзень выпуску паштовай маркі ў сталічным аддзяленні паштовай сувязі №1 (крама «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16) адбылося спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень». Да гэтага ж выпуску падрыхтаваны карткі для картмаксімумаў. Дызайн Марыны Віткоўскай

## Даты | Падзеі | Людзі

### 4 СТУДЗЕНЯ

**1729** год — нарадзіўся (маёнтак Шчорсы Навагрудскага павета) Іахім Літавор Храптовіч, грамадска-палітычны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ, філосаф, публіцыст, паэт і перакладчык. Кіраўнік каралеўскай групоўкі магнатаў і шляхты ў Вялікім Княстве Літоўскім з 1780 года, міністр замежных спраў з 1791-га, канцлер ВКЛ — з 1793-га. У сваіх маёнтках у Шчорсах і Вішнева замяніў паншчыну аброкам, пабудаваў у Шчорсах палац, школу, уніяцкую царкву, арганізаваў бібліятэку з архівам. Памёр у 1812 годзе.

**1835** год — нарадзіўся (Слуцкі павет) Вітольд Аляксандравіч Наркевіч-Ёдка, беларускі ўрач-афтальмолаг, доктар медыцыны. У 1860—1872 гадах працаваў ардынатарам клінікі састарэлых у Варшаве, затым у Варшаўскім афтальмалагічным універсітэце. З 1863 года — дацэнт Варшаўскай медыка-хірургічнай акадэміі, з 1869-га — Варшаўскай галоўнай школы. Аўтар каля 80 навуковых прац у галіне хвароб вачэй. З 1883 года жыў у сваім маёнтку Бабоўня (цяпер — Капыльскі раён), займаўся сельскай гаспадаркай, рабіў аперацыі ў арганізаванай ім тут лячэбніцы. Памёр у 1898 годзе.

**1869** год — нарадзіўся (вёска Добасна, цяпер у Кіраўскім раёне) Ядвігін Ш. (Антон Іванавіч Лявіцкі), беларускі пісьменнік, адзін з пачынальнікаў беларускай прозы. Яго літаратурная творчасць шматжанравая. Ён вядомы як аўтар баек у прозе, лірычнага апавядання, сатырычнай замалёўкі, дарожных нататкаў, фельетона, мастацкай публіцыстыкі, мемуараў. Вялікае значэнне для станаўлення буйной празаічнай формы беларускай літаратуры меў яго раман «Золата», які пісьменнік так і не паспеў скончыць. Памёр у 1922 годзе ў віленскім шпіталі. Пахаваны ў Вільні на могілках Росы на Літарацкай горцы.



**1912** год — 105 гадоў таму нарадзіўся (г. Чавусы) Сцяпан Парфёнавіч Маргунскі, беларускі прававед, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар юрыдычных навук, прафесар. Аўтар больш за 70 навуковых прац па праблемах тэорыі і гісторыі станаўлення і развіцця беларускай савецкай сацыялістычнай дзяржаўнасці, суаднасін нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў дзяржаўным будаўніцтве БССР. Пад яго кіраўніцтвам выдадзена «Гісторыя дзяржавы і права Беларускай ССР». Памёр у 1978 годзе.

**1930** год — апублікавана кніга К.Э. Цыялкоўскага «Рэактыўны аэраплан», у якой вучоны абгрунтаваў прымяненне ракетных рухавікоў у авіяцыі: «За эрай аэрапланаў вінтавых павінна прыйсці эра аэрапланаў рэактыўных».

### Было сказана

**Алесь ЗВОНАК, паэт, драматург, перакладчык:**

*«У малым вялікае ўбачыш толькі розумам, Створана вялікае з дробных велічынь».*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.27 | 17.02 | 7.35 |
| Віцебск — | 9.24 | 16.44 | 7.20 |
| Магілёў — | 9.18 | 16.52 | 7.34 |
| Гомель — | 9.06 | 16.57 | 7.51 |
| Гродна — | 9.41 | 17.19 | 7.38 |
| Брэст — | 9.34 | 17.28 | 7.54 |

### Месяц

*Першая квадра 5 студзеня. Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр.* Настассі, Дзмітрыя, Фёдара. *К.* Ангелікі, Анелі, Рыгора, Яўгена.



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Нарэшце я знайшла самае лепшае апісанне, як сустракаць Новы год... Аказваецца НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА прыбіраць кватэру перад Новым годам, таму што певень любіць хаос і беспарадак!**

— Чым адрозніваецца наш кот ад еўрапейскага?

— Тым, што наш кот на генетычным узроўні разумее, што мяўкаць і прасіць ежы раніцай 1 студзеня не толькі бессэнсоўна, але і небяспечна для жыцця...

**Як і прагназавалі сіноптыкі, 1 студзеня не ўсюды выпаў снег, аднак ніхто з жыхароў гэтых раёнаў не засмуціўся і не адмяніў запланаванае катанне на санках!**

— Ты аліўе будзеш?

— Не.

— Тады я ў ім буду спаць.




Малюнак Алега ПАПОВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 102.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 студзеня 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12